WWW.ZVIAZDA.BY — на 12 гадзін раней

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

21 СНЕЖНЯ 2011 г. СЕРАДА № 243 (27107)

Кошт 800 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 г.

## МЭТА — УМАЦАВАННЕ МІРУ І БЯСПЕКІ

**Прэзідэнты краін АДКБ пацвердзілі гатоўнасць наладжваць практычнае ўзаемадзеянне з НАТА. Аб гэтым гаворыцца ў падагульняючай заяве кіраўнікоў дзяржаў — членаў АДКБ, падпісанай па выніках саміту ў Маскве, перадае БЕЛТА.**

Кіраўнікі дзяржаў канстатавалі, што дагавор, заключаны ў 1992 годзе ў Ташкенце, дастойна выконвае сваю галоўную функцыю інструмента, што забяспечвае падтрыманне бяспекі і стабільнасці, тэрытарыяльнай цэласнасці і суверэнітэту дзяржаў-удзельніц.

«Прыкладзеныя намі намаганні па ўмацаванні дагавора і яго адаптацыі да сучаснай геапалітычнай сітуацыі далі магчымасць актывізаваць ваенна-палітычнае ўзаемадзеянне і пачаць фарміраванне эфектыўнай сістэмы калектыўнай бяспекі і процідзеяння новым выклікам і пагрозам», — гаворыцца ў заяве. Прэзідэнты адзначылі, што, маючы неабходны сілавы патэнцыял для забеспячэння бяспекі і стабільнасці дзяржаў-членаў, арганізацыя аддае прыярытэт палітычным сродкам пры вырашэнні пастаўленых перад ёю задач.

«Мы задаволены нашым узрослым узаемадзеяннем на міжнароднай арэне, удасканаленнем знешнепалітычнай каардынацыі па асноўных пунктах глабальнага і рэгіянальнага парадку дня. Актывізуецца супрацоўніцтва АДКБ з ААН і іншымі міжнароднымі і рэгіянальнымі арганізацыямі, прапрацоўваюцца мадальнасці яе ўдзелу ў калектыўнай міратворчай дзейнасці», — пацвердзілі кіраўнікі дзяржаў.

«За перыяд, што мінуў з моманту падпісання дагавора, міжнародныя адносіны ўсё часцей характарызуюцца абвастрэннем напружанасці. Сур'ёзны непакой выклікае ўзрастаючая тэндэнцыя да сілавога ўмяшання ў крызісныя сітуацыі. Насцярожваюць спробы дзейнічаць у абыход агульнапрызнаных міжнародна-прававых норм і прынцыпаў, выкарыстоўваючы часовыя цяжкасці асобных краін і народаў», — гаворыцца ў дакуменце.

Краіны АДКБ адзначаюць, што аднабаковае разгортванне стратэгічных сістэм ПРА адной дзяржавай або групай дзяржаў без уліку законных інтарэсаў іншых краін і без прадастаўлення апошнім юрыдычна абавязваючых гарантый можа нанесці ўрон міжнароднай бяспецы і стратэгічнай стабільнасці ў Еўропе і ў свеце ў цэлым.

«Напярэдадні 20-гадовага юбілею дагавора і 10-годдзя АДКБ мы зноў заяўляем аб сваёй прыхільнасці мэтам фарміравання больш справядлівага і дэмакратычнага поліцэнтрычнага светапарадку, якія грунтуюцца на прызнанні вяршэнства міжнароднага права, калектыўных падыходах да вырашэння міжнародных праблем, павазе Статута ААН. Упэўнены, што АДКБ і ў далейшым будзе выступаць канструктыўным фактарам у справе ўмацавання міжнароднага і рэгіянальнага міру і бяспекі», — падкрэсліваецца ў заяве.

Беларусь завяршае сваё старшынства ў статутных органах АДКБ і перадае функцыі старшыні Казахстану.

## ЧАС АДКАЗАЎ НА ЎСЕ ПЫТАННІ

**Прэзідэнты краін СНД сабраліся ўчора ў Маскве на нефармальны юбілейны саміт. Удзел у ім прыняў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка, перадае БЕЛТА.**

Адкрываючы сустрэчу, Прэзідэнт Расіі Дзмітрый Мядзведзеў адзначыў, што за 20 гадоў існавання Садружнасць прайшла вельмі няпросты шлях развіцця, аднак бакі паказалі, што могуць не толькі разумець адзін аднаго, але і эфектыўна супрацоўнічаць. «СНД стала фактарам стабільнасці, уплывовым рэгіянальным аб'яднаннем», — сказаў Дзмітрый Мядзведзеў. Прэзідэнты краін СНД абмеркавалі перспектывы развіцця Садружнасці і новыя сумесныя праекты.

Беларусь будзе і далей працаваць на адзінства СНД, заявіў на пасяджэнні нефармальнага юбілейнага Савета кіраўнікоў дзяржаў СНД Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка. «Мы шмат за што крытыкавалі СНД, але гэта не значыць, што мы працавалі на разбурэнне Садружнасці Незалежных Дзяржаў», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт Беларусі падкрэсліў, што значэнне стварэння СНД у тым, што ёсць дзяржавы, якія значна рушылі наперад у рамках СНД. «Хто хацеў пайсці наперад, той стварыў Мытны саюз, Адзіную эканамічную прастору, аб'яднаўся ў ваенна-палітычны саюз АДКБ, з Расіяй мы рушылі яшчэ далей, ствараючы наш саюз. Хтосьці хацеў застацца на платформе Садружнасці Незалежных Дзяржаў — пакінулі такое права ўсім збірацца ў гэтым фармаце», — сказаў кіраўнік беларускай дзяржавы.

Ён таксама адзначыў, што ўсе інтэграцыйныя ўтварэнні на постсавецкай прасторы выраслі з СНД. «Не было б СНД, не было б дыскусіі, не было б пэўнай незадаволенасці развіццём СНД — мы не стварылі б сёння гэтыя ўтварэнні», — лічыць беларускі лідар. Аляксандр Лукашэнка таксама адзначыў, што распад СССР і стварэнне СНД сёння не маюць патрэбы ў ацэнках, паколькі час ужо адказаў на ўсе пытанні.

БЕЛИНВЕСТБАНК

**ОТКРЫТОЕ АКЦИОНЕРНОЕ ОБЩЕСТВО «БЕЛОРУССКИЙ БАНК РАЗВИТИЯ И РЕКОНСТРУКЦИИ «БЕЛИНВЕСТБАНК»**

**Республика Беларусь, 220002, г. Минск, пр-т Машерова, 29**

**ИЗВЕЩЕНИЕ**
**о проведении внеочередного общего Собрания акционеров ОАО «Белинвестбанк» в заочной форме**

Внеочередное общее Собрание акционеров ОАО «Белинвестбанк» (далее – Собрание) проводится по инициативе Наблюдательного совета банка в 11.00 28 декабря 2011 года в помещении ОАО «Белинвестбанк» по адресу: г. Минск, пр-т Машерова, 29.

**ПОВЕСТКА ДНЯ СОБРАНИЯ:**

1. Об увеличении размера уставного фонда открытого акционерного общества «Белорусский банк развития и реконструкции «Белинвестбанк».
2. Об утверждении Решения о выпуске акций открытого акционерного общества «Белорусский банк развития и реконструкции «Белинвестбанк».
3. О внесении изменений в Устав открытого акционерного общества «Белорусский банк развития и реконструкции «Белинвестбанк».

Дата формирования реестра владельцев ценных бумаг для составления списка лиц, имеющих право на участие в Собрании, – 20 декабря 2011 года.

Лицо, имеющее право на участие в Собрании, может ознакомиться с формой и текстом бюллетеня для заочного голосования, проектами решений по вопросам повестки дня и получить бюллетень для заочного голосования под роспись с представлением документа, удостоверяющего личность (представитель акционера – также документа, подтверждающего полномочия на участие в Собрании) при личном посещении Центрального аппарата (г. Минск, пр-т Машерова, 29, комн. 705), филиалов, дирекций ОАО «Белинвестбанк» по месту учета акций со дня извещения о проведении Собрания в рабочие дни с 9.00 до 12.00 и с 14.00 до 16.00.

Заполненные бюллетени для заочного голосования должны быть представлены лично либо направлены для участия в Собрании, в адрес ОАО «Белинвестбанк»: 220002, г. Минск, пр-т Машерова, 29, по почте или курьером по 25 декабря 2011 года включительно.

Принявшим участие в Собрании считается лицо, заполненный бюллетень для заочного голосования которого представлен в ОАО «Белинвестбанк» в указанном порядке.

**Дополнительная информация по телефонам: (8 017) 239 02 88, 239 01 42.**

**www.belinvestbank.by**

Лицензия на осуществление банковской деятельности № 3 выдана Национальным банком Республики Беларусь 27 октября 2006 г.

Павіншуйце Вашых партнёраў з Новым годам і Калядамі!
Сэрвіс друку НАВАГОДНІХ фірменных ПАШТОВАК
InterPrint.by
офіс (017) 298 41 68
МТС (029) 775 57 18
Мабільныя тэлефоны SNAMI® SNAMI.BY
ООО «ТЦ СНАМИ» УНП 100705382

ISSN 1990 - 763X



## ЗВЯНО БУДУЕ РОДНЫ ГОРАД

**Мікалай Мардзялёў, будаўнік са стажам больш чым сорак гадоў, і яго малады калега Аляксандр Кандрацёнак (на фота) працуюць адным звяном на ўзвядзенні новага мікраёна ў Чавусах. Праект пяціпавярховага дома, на якім гэтыя муляры кладуць цэглу, мае цікавую назву — «Чавускі тракт». Нягледзячы на пенсійны ўзрост, Мікалай Міхайлавіч працягвае адбудоўваць родны горад і ахвотна перадае свой вопыт моладзі.**

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Парламенцкі дзённік

## БЮДЖЭТ-2012: БЕЗ ДЭФІЦЫТУ

### НІ БОЛЬШ, НІ МЕНШ

**НАЛЕТА бюджэтная палітыка арыентавана перш-наперш на забеспячэнне макрафінансавай збалансаванасці, выкананне гарантаваных дзяржавай абавязкаў і дасягненне параметраў фінансавай бяспекі. Менавіта таму даходы і расходы звярстаныя на бяздэфіцытнай аснове. І для рэспубліканскага бюджэту яны прагназуюцца ў аб'ёме 92,77 трлн рублёў. Праект бюджэту-2012 прадставіў увазе сенатараў першы намеснік міністра фінансаў Беларусі Уладзімір АМАРЫН. Ён падкрэсліў, што налета давядзецца скараціць усе непершачарговыя выдаткі. Крэдытаванне дзяржпраграм будзе весціся толькі ў тых аб'ёмах, якія не ствараюць рызыкі для макрафінансавай стабільнасці. Аднак якасць бюджэтных паслуг і сацыяльная абарона найбольш уразлівых катэгорый насельніцтва захаваюцца.**

Захоўваецца ў цэлым сацыяльная арыентаванасць бюджэту. Значную частку ў ім складуць выдаткі на аплату працы, пенсіі, стыпендыі, іншыя выплаты, сродкі на выкананне дзяржаўных сацыяльных стандартаў. Прыярытэтнымі для фінансавання будуць сферы аховы здароўя, адукацыі і навукі.

Адна з асаблівасцяў новага бюджэту — значнае павелічэнне расходаў па пагашэнні і абслугоўванні дзяржаўнай і мясцовых пазык. На канец 2012 года знешняя дзяржпазыка складзе каля 14 млрд долараў ЗША. Першы намеснік міністра фінансаў акцэнтаваў, што новых знешніх запазычанняў, апроч ужо дасягнутых дамоўленасцяў, налета не плануецца.

Сенатар Антаніна Морава падчас абмеркавання законапраекта выказала занепакоенасць зніжэннем выдаткаў на моладзевую палітыку амаль удвая ў параўнанні з прапорцыямі, закладзенымі ў мінулагоднім бюджэце. Першы намеснік міністра патлумачыў новыя лічбы рэарганізацыямі ў структурах, адказных за моладзевую палітыку, і запэўніў, што паводле разлікаў Мінфіна, запланаваных сродкаў будзе дастаткова для фінансавання моладзевай палітыкі.

Адказваючы на пытанні сенатараў, першы намеснік міністра нагадаў, што сярэднегадавы курс долара, закладзены ў бюджэце, — каля 9 тыс. рублёў.

Цікавіліся сенатары таксама і лёсам базавай велічыні (нагадаем, зараз гэта 35 тыс. рублёў), якая па многіх параметрах ужо даўно не выконвае сваіх функцый. Уладзімір Амарын прызнаў, што «прапановы па яе руху» профільнымі міністэрствамі, насамрэч, абмяркоўваюцца. З аднаго боку, варта было б яе павялічыць. З іншага, ёсць фактары, якія сведчаць на карысць таго, што змяняць яе не трэба. Так, напрыклад, «пры разліку сацыяльных выплат, трэба было б адысці ад базавай велічыні, бо яна нічога не вызначае». А вось у дачыненні да штрафаў — «пытанне неадназначнае», звяртае ўвагу першы намеснік міністра фінансаў. Маўляў, з павелічэннем базавай павялічацца і штрафы. «Рашэнне пакуль не прынятае», — рэзюмаваў У.Амарын.

Ухваленыя ўчора сенатарамі папраўкі ў Падатковы кодэкс, паводле слоў першага намесніка міністра, забяспечваюць далейшае спрашчэнне айчыннай падатковай сістэмы, парадку налічэння і выплаты канкрэтных падаткаў, зніжэнне падатковай нагрузкі на эканоміку ў 0,46 адсотка да ВУП.

На чарговым пасяджэнні сесіі члены Савета Рэспублікі ўхвалілі таксама праект бюджэту дзяржаўнага пазабюджэтнага фонду сацыяльнай абароны насельніцтва на 2012 год. Даходы фонду прагназуюцца ў аб'ёме амаль 47,6 трлн рублёў. Найбольшую ўдзельную вагу ў іх, паводле слоў **міністра працы і сацыяльнай абароны Марыяны ШЧОТКІНАЙ,** складуць абавязковыя страхавыя ўзносы. На іх прыйдзецца 99,6 адсотка. Узносы на прафесійнае пенсійнае страхаванне «заважаць» 0,4 адсотка ў структуры даходаў фонду.

Расходы пойдуць пераважна на пенсіі. Пры разліках браўся сярэдні памер пенсіі каля 1,2 млн рублёў, а колькасць яе атрымальнікаў праганазавалася ў 2,5 млн чалавек. Астатнія сродкі з фонду мяркуецца выдаткаваць на выплату дапамог, — напрыклад, па часовай непрацаздольнасці, па цяжарнасці і родах, а таксама сем'ям, якія выхоўваюць дзяцей.

Такім чынам, парламент сваю місію ў рабоце над бюджэтам будучага года выканаў.

Савет Рэспублікі таксама ратыфікаваў учора міжурадавае беларуска-расійскае пагадненне аб супрацоўніцтве ў галіне даследавання і выкарыстання касмічнай прасторы ў мірных мэтах. Дакумент, па сутнасці, дае прававыя падставы для запуску спадарожніка. Як патлумачыў, адказваючы на пытанні парламентарыяў, **першы намеснік старшыні Нацыянальнай Акадэміі навук Беларусі Пётр ВІЦЯЗЬ,** беларускі спадарожнік прайшоў наземныя выпрабаванні. Аднак расійскі бок замовіў праграмнае забеспячэнне ў Англіі. «На жаль, атрымаліся збоі», — канстатаваў навукоўца. Давядзецца ўсе апараты праверыць паўторна. У цэлым жа праграма працуе. Паводле яго інфармацыі, яна праходзіць апошнія выпрабаванні. У студзені 2012 года беларускі спадарожнік павінен быць выведзены на Байканур, налета ў канцы сакавіка — пачатку красавіка павінен адбыцца запуск. Аб'ёмы выдаткаў Беларусі на касмічныя праекты складаюць ужо 40 млн долараў, а да 2014 года яны павялічацца, як чакаецца, да 200 млн долараў.

Ратыфікавана было і міжурадавае пагадненне аб Кітайска-Беларускім індустрыяльным парку, які размесціцца каля Нацыянальнага аэрапорта «Мінск» на плошчы каля 80 кв. км. Спецыялізацыяй дзейнасці прадпрыемстваў парку будуць такія галіны, як тонкая хімія, нана- і біяфармацэўтыка і іншыя. Ад рэалізацыі праекта беларускі бок чакае, як распавёў **намеснік міністра эканомікі Анатоль ФІЛОНАЎ,** стварэння ў нашай краіне новых экспарта-арыентаваных інавацыйных вытворчасцяў, прыцягнення перадавога досведу, навукова-тэхнічнага патэнцыялу і значнага прытоку прамых замежных інвестыцый. Ён акцэнтаваў, што пад дахам парку могуць працаваць не толькі беларускія і кітайскія, але і любыя іншыя міжнародныя кампаніі, якія займаюцца высокатэхналагічнай вытворчасцю. За ўзровень прэферэнцый бяруцца СЭЗ і ПВТ (дзе льготны перыяд распаўсюджваецца, між іншым, на 20 гадоў). Пагадненне, паводле слоў намесніка міністра, забяспечвае праекту падтрымку на самым высокім узроўні і наданне парку статусу міжурадавага.

**Ала МАЧАЛАВА.**

## Курс еўра абваліўся да самага нізкага абменнага ўзроўню

**Абменны курс еўра ўпаў ніжэй за $1,3 на фінансавым рынку Еўрасаюза ў завяршальныя гадзіны яго работы ў мінулы панядзелак. Учора за адзін еўра ў ЕС давалі $1,2996.**

Такім чынам, за апошнія 24 гадзіны адзіная еўрапейская валюта абясцэнілася адносна амерыканскай на 0,4 працэнта. Гэта самы нізкі абменны ўзровень еўра за апошні амаль год.

Адток інвестараў ад еўра быў выкліканы ў мінулы панядзелак няўдачай пасяджэння міністраў фінансаў краін Еўрасаюза, калі ім не ўдалося ўзгадніць выдзеленыя ад ЕС 200 млрд еўра на павелічэнне капіталу Міжнароднага валютнага фонду (МВФ). Гэта сума павінна была паступіць у спецыяльную праграму МВФ па аказанні дапамогі шэрагу краін еўразоны.

Аднак Вялікабрытанія адмовілася прадастаўляць МВФ дадатковыя сродкі. Кіраўніцтва ЕС спадзявалася, што Лондан выдзеліць амаль 30 млрд еўра. У выніку міністры фінансаў краін зоны еўра, у якую ўваходзяць 17 дзяржаў ЕС, дамовіліся выдзеліць МВФ 150 млрд еўра.

Вынікі праведзенага пасяджэння кіраўнікоў мінфінаў краін Еўрасаюза былі ўспрыняты рынкам як сведчанне далейшага ўзмацнення ўнутранага крызісу ЕС, які не дае магчымасці яму прымаць хуткія і эфектыўныя захады па пераадоленні даўгавога крызісу еўразоны.

| Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 21.12.2011 г. (для б/н разлікаў) | | |
|---|---|---|
| ▼ 1 долар ЗША ... 8 430,00 | 1 чэшская крона ... 432,55 | |
| ▼ 1 еўра ... 10 097,00 | 1 польскі злоты ... 2 453,29 | |
| 1 латвійскі лат ... 15 743,77 | ▼ 1 расійскі рубель ... 263,00 | |
| 1 літоўскі літ ... 3 177,83 | 1 украінская грыўня ... 1 052,63 | |

| Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў Цэнтрабанк РФ | |
|---|---|
| USD | 32,0519 |
| 10 UAH | 40,0224 |
| 10000 BYR | 37,8864 |
| EUR | 41,7059 |

## ТЫХ, ХТО ШУКАЕ ПРАЦУ, СТАЛА БОЛЬШ, але ў асноўным — гэта пасіўны пошук

**ШТО здарылася з беларускім рынкам працы ў гэты няпросты год? Якія прафесіі найбольш запатрабаваны? Чаго не хапае нашым работнікам для працы за мяжой? На гэтыя пытанні карэспандэнт «Звязды» атрымаў адказы ад дырэктара інтэрнэт-сайта па пошуку працы і падборы персаналу RABOTA.TUT.BY Святланы Шапаравай.**

**— Як паўплываў крызіс на рынак працы?**

— Безумоўна, складаная эканамічная сітуацыя не магла не адбіцца на рынку працы Беларусі. Напрыклад, калі ўзяць статыстыку (HeadHunter: Беларусь, праект RABOTA.TUT.BY), то да сакавіка прырост рэзюмэ ў нашай базе звестак быў стабільным — 12-15 тысяч у месяц. Са жніўня ж пачаўся прырост на 19 тысяч штомесячна, які цягнецца ўжо пяты месяц. Аднак такія высокія паказчыкі зусім не азначаюць, што ўсе гэтыя людзі аказаліся на вуліцы і вымушаны шукаць сабе новае месца працы. Як правіла, большасць з гэтых рэзюмэ належыць тым, хто займаецца так званым пасіўным пошукам: зараз у чалавека ёсць праца, але ён размяшчае сваё рэзюмэ з надзеяй на тое, што зможа атрымаць больш прыемную альбо цікавую прапанову. Плюс да гэтага — зараз сезон пошуку працы.

**— Якія вакансіі зараз самыя папулярныя?**

— Гэта вакансіі сферы продажаў, інфармацыйных тэхналогій, транспарту і лагістыкі (кіроўцы таксі, кіроўцы-экспедытары, работнікі склада, спецыялісты па закупках), маркетынгу і рэкламы, бухгалтэрыі і фінансаў. Таксама шмат запрашаюць працоўнага персаналу.

**— Спецыялісты якіх прафесій найбольш запатрабаваны?**

— Стабільна адчувае сябе IT-сфера. Зараз на сайце больш за тысячу падобных прапаноў. Затым ідзе сфера прадуктовага рознічнага гандлю.

У апошні час адзначаецца павелічэнне колькасці вакансій для спецыялістаў сферы продажаў, бо менавіта гэтыя спецыялісты маюць дачыненне да даходнай часткі бюджэту любой кампаніі.

**— Зараз часцей шукаюць працу па спецыяльнасці ці не?**

— Па розных прычынах пэўны працэнт людзей, якія шукаюць работу, як вы кажаце, не па спецыяльнасці, быў заўсёды. Прычыны ў кожнага свае: прафесія не можа прынесці добрага даходу; адсутнасць перспектыў; разуменне, што менавіта гэта прафесія не з'яўляецца прызваннем чалавека.

**— Чаму працадаўцы хочуць браць работнікаў з вопытам працы?**

— Кампаніі, якія шукаюць супрацоўнікаў з вопытам працы, можна зразумець. Яны хочуць узяць на работу тых спецыялістаў, на навучанне якіх можна скарыстаць менш рэсурсаў. У большасці вакансій, якія размешчаны на нашым сайце, вопыт не мае значэння. Глядзіце: не мае значэння — 10349 вакансій; без вопыту працы — 2935 вакансій; вопыт ад 1 да 3 гадоў — 5764 вакансіі; вопыт ад 3 да 6 гадоў — 1481 вакансія; вопыт больш за 6 гадоў — усяго 180 вакансій.

**Некаторыя прыклады прапанаванай і пажаданай заработнай платы (у беларускіх рублях)**

| Прафесія | Прапанаваная | Пажаданая |
|---|---|---|
| Грузчык | 1 800 000 — 2 000 000 | 2 000 000 — 2 200 000 |
| Кіроўца | 2 500 000 — 3 000 000 | 2 500 000 — 3 000 000 |
| Прыбіральшчыца | 1 200 000 — 1 500 000 | 1 200 000 — 1 500 000 |
| Бухгалтар | 2 200 000 — 2 700 000 | 2 200 000 — 3 000 000 |
| Маркетолаг | 3 000 000 — 3 500 000 | 3 000 000 — 3 500 000 |
| Сакратар | 2 200 000 — 2 600 000 | 2 000 000—2 500 000 |

**— А што рабіць моладзі?**

— Маладыя спецыялісты могуць падстрахавацца, набываючы вопыт яшчэ ў час навучання. Ёсць працадаўцы, якія прапануюць стажыроўку, частковую занятасць ці бяруць супрацоўнікаў на няпоўны рабочы дзень. Безумоўна, аплата працы на парадак ніжэйшая, чым аплата таго, хто працуе поўны дзень, аднак гэта набыццё каштоўнага досведу. У нас ёсць 579 вакансій частковай занятасці, 18 — стажыровак.

**Уладзіслаў КУЛЕЦКІ.**

Свята ў горадзе

## ЯК СТАЛІЦА ПАДРЫХТАВАЛАСЯ ДА НАВАГОДНІХ СВЯТАЎ?

**Тэатралізаванае шэсце Дзядоў Марозаў і Снягурак, якое пройдзе 24 снежня, збярэ сёлета больш за 700 казачных персанажаў. У склад «казачнага натоўпу» ўвойдуць прадстаўнікі з усіх раёнаў сталіцы.**

Як паведаміла **Віталіна РУДЗІКАВА, начальнік упраўлення культуры Мінскага гарвыканкама,** шэсце будзе рухацца ад Кастрычніцкай плошчы і да Палаца спорту, каля якога пройдзе тэатралізаванае прадстаўленне і разгорнецца калядны кірмаш.

У той жа дзень адбудзецца дабрачынная акцыя «Падары свята дзецям» — Дзед Мароз і Снягурка з фіналістамі конкурсу прыгажосці «Міс Мінск-2011» будуць віншаваць са святам дзяцей, якія знаходзяцца на лячэнні ва ўстановах аховы здароўя.

### Кірмашы і ёлкі

З 23 снежня ў сталіцы распачнуць працу каля 150 елачных базараў. Як удакладніў **Андрэй НОВІКАЎ, начальнік упраўлення гандлю і паслуг Мінскага гарвыканкама,** у гэты час плануецца рэалізаваць каля 40 тысяч натуральных елак.

На двух пляцоўках сталіцы — на Кастрычніцкай плошчы і каля Палаца спорту — з 15 снежня ўжо працуюць т.зв. «калядныя кірмашы». Як заначыў Андрэй Новікаў, такія кірмашы ў Мінску арганізаваны ўпершыню і працаваць будуць да 8 студзеня ўключна (час працы — з 12:00 да 20:00).

— Калі такая форма абслугоўвання мінчанам і гасцям горада прыйдзецца даспадобы, налета такая практыка будзе пашырана, — заключыў Новікаў. — Першыя дні працы гэтых кірмашоў ужо засведчылі пра іх запатрабаванасць: за першыя пяць дзён рэалізавана прадукцыі на 100 мільёнаў рублёў.

Дабрачынная гарадская ёлка сёлета пройдзе на базе Белдзяржцырка. Паводле слоў **начальніка адзела ідэалагічнай і выхаваўчай работы Камітэта па адукацыі Мінскага гарвыканкама Надзеі ВЯЛІКАЙ,** у мерапрыемстве прымуць удзел каля 1500 дзяцей. Падчас акцыі «Нашы дзеці» ў Мінску пройдзе больш за 300 святочных мерапрыемстваў.

**Памятка кіроўцам:**

31 снежня з 20:00 будзе абмежаваны рух і забаронены ўезд на завулак Канатны (тэрыторыя, якая прымыкае да гасцініцы «Планета») па вул. Мельнікайтэ; вул. Мельнікайтэ ад вул. Дзімітрава да вул. Заслаўскай; на пляцоўцы ля Палаца спорту да вул. Няміга і на тэрыторыі, якая прымыкае да Кастрычніцкай плошчы. Абмяжуюць праезд і каля святочных пляцовак у мікрараёнах сталіцы, у тым ліку і каля Нацыянальнай бібліятэкі. У раёне правядзення феерверку на пр. Пераможцаў адміністрацыя папярэджвае пра магчымае абмежаванне руху.

### Праходзіць на свята з жывёламі не дазволяць

Адным з галоўных месцаў правядзення святочных мерапрыемстваў у навагоднюю ноч будзе пляцоўка ля Нацыянальнай бібліятэкі (праграма «Карнавальная ноч»).

— Сёлета на Кастрычніцкай плошчы і ля галоўнай ёлкі сталіцы будуць працаваць незвычайныя аніматары — казачныя і калядныя персанажы, — заначае Віталіна Рудзікава. — Святочны феерверк адбудзецца каля абеліска «Мінск — горад-герой». Феерверк распачнецца ў 01:00 і будзе працягвацца 20 хвілін.

Ілюмінацыя на ёлках у гэтым годзе павялічана на 10 тысяч лямпачак. Увогуле падсветка будзе працаваць да 13 студзеня ўключна. Паводле слоў **Уладлена ЧУХІНА, начальніка вытворчага аддзела УП «Мінгасвятло»,** цалкам ілюмінацыю задзейнічаюць 24, 25, 31 снежня, а таксама 1, 7, 8 і 13 студзеня.

**Што будзе яшчэ?**

**22.12** — Навагодні алімпійскі баль з удзелам усіх алімпійскіх чэмпіёнаў, пераможцаў чэмпіянатаў Еўропы і свету — жыхароў Мінска. У гэты ж дзень тут будуць падведзены спартыўныя вынікі 2011 года (Гарадская ратуша).

**24.12** — спаборніцтвы па мастацкай гімнастыцы «BabyCap» (Палац спорту).

**24 — 25.12** — агульнагарадскі кірмаш «Навагодні падарунак» (пляцоўка ля Палаца спорту, Кастрычніцкая плошча).

**25.12** — ва ўнутраным дворыку Музея гісторыі г. Мінска адбудзецца праграма «Мінскія вячоркі». У музеі будзе працаваць выстаўка экспанатаў з прыватных калекцый мінчан «Новы год — час мінскі».

**04-07.01.2012** — VIII Калядны міжнародны турнір аматараў хакея на прызы Прэзідэнта Беларусі з удзелам каманд з Аўстрыі, Канады, Славеніі, Фінляндыі, Чэхіі, Швецыі, Расіі і Беларусі (Палац спорту, «Мінск-Арэна», Лядовы палац на вул. Прытыцкага).

На святочныя мерапрыемствы будуць арганізаваны адмысловыя пункты пропуску з металадэтэктарамі. Увогуле па сталіцы будзе задзейнічана каля 16 КПП з 58 пунктамі пропуску. Як папярэдзілі ва ўпраўленні аховы правапарадку Мінгарвыканкама, людзей з хатнімі жывёламі на святы пускаць не будуць.

### Як будуць працаваць?

Ужо з 15 снежня гандлёвыя аб'екты і аб'екты грамадскага харчавання перайшлі ў рэжым падаўжэння працоўнага дня. 750 прадуктовых магазінаў і 4 універмагі падоўжылі працоўны дзень да 22:00, 1850 нехарчовых — да 21:00.

Аб'екты грамадскага харчавання пры наяўнасці замоў на карпаратыўныя мерапрыемствы будуць працаваць да шасці гадзін раніцы — у выпадку, калі яны не ўбудаваны ў жылыя будынкі. Усяго ў навагоднюю ноч у Мінску будуць працаваць 312 аб'ектаў грамадскага харчавання і 9 кругласутачных магазінаў.

**Ілья ЛАПАТО.**

АУКЦИОНЫ ПО ПРОДАЖЕ КОММЕРЧЕСКОЙ НЕДВИЖИМОСТИ
WWW.RLT.BY

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

**Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Агрокомбинат «Дзержинский» (продавец)**

проводит **повторный** открытый аукцион по продаже **одним лотом** имущества, расположенного по адресу: **Минская область, Дзержинский р-н, г. Дзержинск, ул. Омельянюка, д. 30**, в составе: здание завода (инв. № 620/С-29150), об. пл. 1940,7 кв.м; здание котельной (инв. № 620/С-29157), об. пл. 603,8 кв.м; здание мойки автомолцистерн (инв. № 620/С-29151), об. пл. 371,1 кв.м; здание материального склада (инв. № 620/С-29177), об. пл. 160,7 кв.м; здание гаража (инв. № 620/С-29179), об. пл. 107,2 кв.м; здание конторы (инв. № 620/С-29155), об. пл. 105,8 кв.м; здание мазутонасосной (инв. № 620/С-29158), об. пл. 84,0 кв.м; здание трансформаторной (инв. № 620/С-29153), об. пл. 55,3 кв.м; здание ленуголка (инв. № 620/С-29152), об. пл. 52,1 кв.м; здание насосной станции 2-го подъема (инв. № 620/С-29159), об. пл. 26,1 кв.м; проходная будка (инв. № 620/С-29156), об. пл. 8,0 кв.м; а также сооружений и оборудования.

**Начальная цена с НДС – 6 106 878 780 бел. руб.**

Площадь земельного участка – **3,1673 га** (предоставлен продавцу на праве постоянного пользования).

**Задаток 10% от начальной цены перечисляется на р/с № 3012108260016 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», БИК 153001369, г. Минск, УНП 690324015, Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».**

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 2 (двух) дней после проведения аукциона. Оплата за объект производится в течение 10 (десяти) банковских дней со дня проведения аукциона, если иное не предусмотрено договором купли-продажи.

**Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в Условиях его проведения, размещенным на сайте организатора аукциона www.rlt.by.**

*Предыдущее извещение о проведении торгов опубликовано в газете «Звязда» от 28.10.2011.*

Аукцион состоится **28.12.2011** в 11.00 по адресу: г.Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **27.12.2011** до 17.00 по указанному адресу.

**Тел.: (8017) 224 61 34; 500 47 12.**

# БОЛЬШ ЯК BR1 МЛРД НАКІРАВАНА Ў 2011 г. НА ПАДТРЫМКУ ТВОРЧАЙ МОЛАДЗІ

**Аляксандр Лукашэнка сваім распараджэннем зацвердзіў рашэнні савета спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы таленавітай моладзі, паведамілі БЕЛТА ў прэс-службе кіраўніка дзяржавы.**

У прыватнасці, зацверджана рашэнне савета спецыяльнага фонду, звязанае з заахвочваннем лепшых прадстаўнікоў творчай моладзі і стварэннем умоў для развіцця здольнасцяў творча адораных прадстаўнікоў маладога пакалення. На гэтыя мэты выдзелена Br491,5 млн.

З названых сродкаў па рашэнні Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь будуць назначаны 4 стыпендыі, выплачаны 32 заахвочвальныя прэміі і 7 гранд-прэмій фонду лаўрэатам міжнародных і нацыянальных фестываляў і конкурсаў, аказана матэрыяльная дапамога 8 актыўным удзельнікам мастацка-творчых мерапрыемстваў на агульную суму Br54,2 млн.

Кіраўнік дзяржавы падтрымаў таксама прапановы савета фонду аб выдзяленні Br259,2 млн для заснавання прызавых фондаў Рэспубліканскага адкрытага конкурсу выканаўцаў на народных інструментах імя І.І. Жыновіча, II Міжнароднага конкурсу імя Л.П. Александроўскай, IX Рэспубліканскага адкрытага конкурсу выканаўцаў фартэпіяннай музыкі, V Рэспубліканскай музычна-тэарэтычнай алімпіяды, Br52,7 млн — на набыццё музычных інструментаў і абсталявання для заняткаў мастацкай творчасцю для дзіцячай музычнай школы № 2 г. Гродна, Br125,3 млн — на арганізацыю і правядзенне Рэспубліканскай мастацкай выстаўкі і справаздачнага канцэрта стыпендыятаў, дыпламантаў і лаўрэатаў спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы таленавітай моладзі.

Такім чынам, у цэлым у 2011 годзе на падтрымку творчай моладзі накіравана больш як Br1 млрд.

Прыняцце распараджэння Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь дасць магчымасць забяспечыць адрасную дзяржаўную падтрымку лепшых прадстаўнікоў таленавітай моладзі, стварыць спрыяльныя ўмовы для творчага росту юных талентаў.

## АЛЯКСАНДР ЛУКАШЭНКА ПАВІНШАВАЎ ПРЭЗІДЭНТА ГРУЗІІ МІХЕІЛА СААКАШВІЛІ З ДНЁМ НАРАДЖЭННЯ

«Упэўнены, што традыцыйна сяброўскія адносіны паміж нашымі народамі і ўзаемавыгаднае беларуска-грузінскае супрацоўніцтва будуць і надалей паслядоўна развівацца і ўмацоўвацца», — гаворыцца ў віншаванні.

**Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**

# ГАЛОЎНАЕ — ПАВЫШЭННЕ ЗАРОБКУ

Па выніках года сярэдняя заработная плата на Віцебшчыне прагназуецца на ўзроўні 2,8 мільёна рублёў. А за снежань 2012-га — 4,9 мільёна. Быццам бы і нядрэнна. Але губернатар Віцебшчыны ўпэўнены, што ўжо зараз ёсць усе магчымасці павялічваць заробак і стымуляваць асабліва ўрачоў, работнікаў культуры і іншых, хто аказвае платныя паслугі.

**Старшыня Віцебскага аблвыканкама Аляксандр КОСІНЕЦ**, звяртаючыся да старшыняў раённых выканаўчых і гарадскіх камітэтаў, дэпутатаў Віцебскага абласнога Савета падчас сесіі Савета адзначыў, што будуць распрацаваны адпаведныя дакументы дзеля таго, каб работнікі сацыяльнай сферы былі зацікаўлены ў павялічэнні аб'ёму платных паслуг, каб аўтары навацый больш атрымлівалі прэміяльных грошай.

— Ад заробленага на платных паслугах трэба максімум аддаваць выканаўцам. Калі трэба, адпаведная ініцыятыва будзе даведзена да ведама ўрада, — падкрэсліў губернатар. — Гэта тычыцца культуры, адукацыі, сацыяльнай сферы ў цэлым. Вось, напрыклад, на 200 — 250 працэнтаў павялічыліся паступленні ад турызму. А якая зарплата экскурсавода? Мільён рублёў? Навошта тады яму старацца, англійскую мову вывучаць? Трэба матываваць такую працу. А медыкі, якія аказваюць платныя паслугі іншаземцам? Напрыклад, у Расіі пяць тысяч долараў каштуюць аперацыі, у нас — менш, але хірургам там плацяць прыкладна 80 працэнтаў ад кошту, а ў нас умудраюцца па сто тысяч рублёў заплаціць. Напрыклад, інавацыйнай прадукцыі атрымалі на дзевяць трыльёнаў рублёў (плюс 27 працэнтаў), а што атрымалі канструктары — тую ж стаўку? Хіба гэта правільны падыход? Неабходна самым уважлівым чынам перагледзець пытанні, звязаныя з зарплатай.

У дачыненні да павышэння зарплаты губернатар запатрабаваў, каб пры гэтым не было папулізму.

— Выплацілі чалавеку сёння 2,8 мільёна рублёў, а заўтра зарплата можа апынуцца на ўзроўні менш чым два мільёны. Гэтага не павінна быць, — канстатаваў старшыня Віцебскага аблвыканкама. — Ужо сёння трэба прадумаць кіраўнікам падыходы, каб палепшыць паказчыкі па выпуску аб'ёму прадукцыі, яе рэалізацыі, ліквідацыі дэбіторскай запазычанасці. Складскія запасы павінны быць ліквідаваныя. Усё гэта дазволіць павышаць зарплату.

Вельмі цяпер актуальна пытанне павышэння заробку ў сувязі з адтокам з Віцебшчыны спецыялістаў праз празрыстую з Расіяй мяжу. Гэта тычыцца, у прыватнасці, тых, хто працуе ў будаўнічай індустрыі, тых жа медыкаў.

— Калі ў Смаленскай вобласці сёння сярэдняя зарплата 800 долараў, у нас — пад тры мільёны рублёў (толькі ў снежні), дзе ж не будзе цякучкі кадраў? — задаў рэзоннае пытанне губернатар прысутным. — Нам трэба за два гады забяспечыць цалкам ураўнаважванне палітыкі цэн і зарплаты. У 2012-2013 гадах заробак у нас павінны быць аднолькавым з расійскім...

У завяршэнні года, перад калляднымі і навагоднімі святамі, губернатар даручыў адказным асобам дайсці да кожнага дома, шматдзетных, маламаёмных сем'яў, адзінокіх мам, якія выхоўваюць дзяцей, пенсіянераў. Усе гэтыя катэгорыі грамадзян згодна з распараджэннем губернатара павінны атрымаць падарункі коштам не менш за пяць базавых велічынь. На гэта спатрэбіцца некалькі мільярдаў рублёў. Матэрыяльную дапамогу губернатар заклікае аказваць у тым ліку і праз прафсаюзы. Акрамя гэтага, трэба арганізаваць сталы заказаў, каб працуючыя змаглі купіць прадукты па прывабных цэнах.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

## «ПЫТАННЕ ЎВЯДЗЕННЯ АДЗІНАЙ ВАЛЮТЫ Ў АЭП СЁННЯ НЕ АБМЯРКОЎВАЕЦЦА, АДНАК НЕ ЗДЫМАЕЦЦА З ПАРАДКУ ДНЯ»

**Пытанне ўвядзення адзінай валюты ў Адзінай эканамічнай прасторы сёння не абмяркоўваецца, аднак не здымаецца з парадку дня. Аб гэтым паведаміў журналістам у Маскве віцэ-прэм'ер Беларусі Сяргей Румас, перадае БЕЛТА.**

«На сёння пытанне аб увядзенні адзінай валюты не абмяркоўваецца. Аднак у кароткатэрміновай і доўгатэрміновай перспектыве гэта пытанне не здымаецца з парадку дня», — сказаў Сяргей Румас.

Разам з тым, паводле яго слоў, «увядзенне адзінай валюты будзе вяршыняй інтэграцыі». «Для гэтага нам трэба паслядоўна прайсці шэраг крокаў па выраўноўванні як макраэканамічнай палітыкі, так і валютнай для таго, каб гэта рашэнне магло быць рэалізавана на практыцы», — растлумачыў Сяргей Румас.

**МАНСАРДНОЕ СТРОИТЕЛЬСТВО В ОКТЯБРЬСКОМ РАЙОНЕ ГОРОДА МИНСКА**

Во исполнение Указа Президента Республики Беларусь от 18.12.2007 № 657 «О некоторых вопросах реконструкции жилых домов» определен перечень жилых домов УП «ЖРЭО Октябрьского района г. Минска», на которых возможна надстройка жилых и нежилых помещений. Это следующие жилые дома:

**№ 51, корп. 3 по ул. Казинца;**
**№ 66 по ул. Казинца.**

Заказчиком реконструкции является УП «ЖРЭО Октябрьского района г. Минска».

Реконструкцию жилых домов планируется производить одновременно с капитальным ремонтом и с письменного согласия большинства собственников. Для этого представителями УП «ЖРЭО Октябрьского района г. Минска» будет осуществляться обход всех квартир, граждане которых являются собственниками жилых помещений, с целью определения их мнения. В случае, если согласие собственников не будет получено в необходимом количестве, а жилой дом включен в Программу капитального ремонта жилищного фонда УП «ЖРЭО Октябрьского района г. Минска» на период 2005--2015 гг., капитальный ремонт будет проводиться без выполнения надстройки.

*УНП 100286730*

## ЗЯЦЁК

У пенсіянеркі з в. Панкі (Івацэвіцкі раён) нехта ўкраў 60 кг сала і 12 бутэлек алею. Сала злодзей выцягнуў з хаты праз гарышча, а алей, сарваўшы замок, дастаў са склепа. Міліцыя выйшла на муляра ПМК — зяця пенсіянеркі. Яго і затрымалі.

**Сымон СВІСТУНОВІЧ.**

Дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь выказваюць глыбокае спачуванне галоўнаму рэдактару газеты «Звязда» **Карлюкевічу Аляксандру Мікалаевічу** ў сувязі з напаткаўшым яго вялікім горам — заўчаснай **смерцю ЖОНКІ**.

**РУПП «ЭКЗОН-ГЛЮКОЗА» проводит конкурс**
на закупку следующих видов товара:

- кизельгур (грубый), кизельгур (средний), перлит, уголь активированный, упаковочный автомат для крахмала кукурузного, изготовление емкости объемом 50 м$^3$ (замочного чана), зерноочистительная машина ОВС-25, проведение энергетического аудита РУПП «Экзон-Глюкоза».

Более подробную информацию можно получить по **тел.: 8 01644 36 393; 36 394.**

*УНП 290215113*

**ОДО «Торговый дом Полюс»**
**ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА**
**по продаже дебиторской задолженности, принадлежащей ОДО «Торговый дом Полюс»**

Организатор торгов: управляющий в деле о банкротстве Бахуревич Елена Владимировна: г. Гродно-25, а/я 13, моб. тел. (8 029) 3608384.
Продавец дебиторской задолженности: ОДО «Торговый дом Полюс», Гродненская обл., г. Лида, ул. Невского, д. 15-6.
**Аукцион состоится в 12.00 06.01. 2012 г. по адресу: г. Лида, ул. Чапаева, 19.**

| Наименование дебитора | Место нахождения дебитора | Номинальная стоимость задолженности | Размер уценки | Начальная цена продажи доли, без НДС, руб. | Задаток, руб. |
|---|---|---|---|---|---|
| ОДО «КОЛОНИАЛЬ» | 220035, г. Минск, пр-т Победителей, д. 57, офис 2 УНП 190674021 | 31 363 200 | 10% | 28 226 880 | 1 411 344 |
| ЧТУП «Кристинаторг» | 231300, г. Сморгонь Гродненской области, ул. Огинского, 17 УНН 590844686 | 1 169 742 | 10% | 1 052 768 | 52 638 |

Заявления и прилагаемые к нему документы принимаются с момента опубликования настоящего извещения по 05 января 2012 г. по адресу: г. Гродно-25, а/я 13.

Задаток перечисляется до 05.01.2012 года (включительно) на р/с 3012140397019, в ЦБУ № 401 ОАО «БПС-Сбербанк» г. Лида , код 369, УНН 590221849.

Условия продажи – без условий.

Минимальная величина первого шага составляет 5 процентов от начальной цены.

Участник торгов имеет право до начала торов письменно отозвать свое заявление на участие в них.

В случае признания торгов несостоявшимися, в связи с подачей заявления на участие в них только одним участником, возможна продажа доли этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5%.

Победителем аукциона признается участник, предложивший наивысшую цену покупки.

Победитель аукциона (претендент на покупку дебиторской задолженности) обязан: - подписать протокол о результатах торгов; - возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам торгов документации, необходимой для их проведения, в течение 3-х рабочих дней со дня проведения торгов; - подписать договор купли-продажи доли не позднее 20 дней с даты подписания протокола о результатах аукциона; - оплатить стоимость дебиторской задолженности в течение 30 календарных дней с даты подписания договора купли-продажи.

# «ЗРАБІЦЬ «ЗВЯЗДУ» НАСТОЛЬНАЙ ГАЗЕТАЙ КОЖНАЙ БЕЛАРУСКАЙ СЯМ'І!»

**Як павысіць аўтарытэт беларускай мовы сярод жыхароў нашай краіны? Адказ на гэтае пытанне шукалі ўдзельнікі Пленума Беларускага славянскага камітэта, сярод якіх прадстаўнікі Міністэрства адукацыі, члены саюза пісьменнікаў Беларусі, навукоўцы.**

### Не рабіць з замежнай мовы свяшчэнную карову

Усе прысутныя сышліся на думцы, што прывіваць любоў да матчынай мовы неабходна з маленства.

— Сёння ў дзіцячых садках вывучаюць англійскую мову, — канстатуе **старшыня Беларускага славянскага камітэта Сяргей КАСЦЯН**. — І гэта нядрэнна, паколькі замежная мова неабходна ў сучасным жыцці. Але ці варта рабіць з яе «свяшчэнную карову», ператвараць у цэнтр адукацыйнай палітыкі? Калі чужая мова будзе прыярытэтнай, ці ж будзе прыярытэтным усё астатняе беларускае, у тым ліку тавары?..

У сувязі з гэтым у Беларускім славянскім камітэце прыйшлі да высновы, што надышоў час перагледзець праграму выхавання ў дзіцячых садках і дапоўніць яе заняткамі роднай мовай.

— На беларускую мову ў дзіцячым садку, — лічыць Сяргей Іванавіч, — дастаткова адводзіць хоць бы 5-10 хвілін у дзень. Ці ж гэта такая вялікая нагрузка на дзяцей? Але пры гэтым неабходна агарнуць беларускія словы сапраўднай любоўю: абавязкова кожную рэч, названую тым ці іншым словам, паказаць візуальна, у прыгожым малюнку, памясціць слова ў адпаведны кантэкст, лепш за ўсё казачны. І ёсць на што абаперціся — на выключна багаты беларускі фальклор, на дзіцячую літаратуру, дзіцячыя часопісы.

Было б таксама вельмі добра, калі б у Міністэрстве адукацыі распрацавалі спецыяльныя праграмы для студэнтаў, якія праходзяць вучэбную практыку. Тады б будучых педагогаў смела можна было прыцягваць да правядзення такіх моўных хвілінак.

Яшчэ адну праблему — праблему садкоў з беларускай мовай навучання — падчас свайго выступу ўзняла **спецыяліст інфармацыйна-аналітычнага ўпраўлення Міністэрства адукацыі Ірына БУЛАЎКІНА**. Паводле яе слоў, мясцовыя органы ўлады гатовы павялічваць колькасць такіх устаноў. Але для гэтага павінна паступіць дастатковая колькасць заяў ад законных прадстаўнікоў дзетак.

Што тычыцца беларускамоўных школ, то на сёння сітуацыя таксама не надта радуе. Большасць бацькоў аддае дзяцей у школы з рускай мовай навучання. Так, у 2010-2011 навучальным годзе ў беларускамоўных установах агульнай сярэдняй адукацыі навучалася толькі 179 947 хлопчыкаў і дзяўчынак (19,1%) з 980 603 вучняў 1-11 класаў.

### Пры распрацоўцы праграм улічваць меркаванні школьнікаў

Не сакрэт, што ўрокі беларускай мовы і літаратуры не заўсёды падабаюцца школьнікам. Каб неяк зацікавіць дзяцей, Беларускі славянскі камітэт прапаноўвае ўвесці за правіла абмяркоўваць вучэбныя праграмы ў СМІ, у інтэрнэце, сярод настаўнікаў школ, выкладчыкаў ВНУ, пісьменнікаў, студэнтаў-філолагаў, дзіцячых псіхолагаў. Менавіта практыкі і павінны быць галоўнымі аўтарамі гэтых праграм, лічаць удзельнікі дыскусіі.

— Сярод вучняў — удзельнікаў гурткоў — можна наладзіць эксперымент: даваць розныя творы, скажам, аднаго аўтара, і на падставе водгукаў саміх дзяцей рабіць хоць нейкія высновы на прадмет далейшага змяшчэння твораў у праграмах, — прапанаваў Сяргей Касцян. — Таксама, магчыма, варта было б для павышэння аўтарытэту беларускай мовы і літаратуры ўвесці, як і ў 90-я гады, абавязковы выпускны іспыт па беларускай літаратуры, вярнуцца да выкладання «Беларусазнаўства» ва ўсіх ВНУ.

А чаму б не папулярызаваць беларускую мову праз развучванне на ўроках музыкі народных песень, а на ўроках фізкультуры — рухомых гульняў? А так атрымліваецца, што японскі школьнік на парозе выпуску ведае 50 народных песень, у нас жа школьнікі, ды, што хаваць, і студэнты, не ведаюць ніводнай.

### Адзін з беларускіх каналаў перавесці на беларускамоўнае вяшчанне

Ва ўмовах дзяржаўнага двухмоўя гістарычна склалася так, што большая частка насельніцтва краіны, хоць і разумее беларускую мову, але размаўляе па-руску. У папулярызацыі роднай мовы сярод беларусаў, лічыць **дырэктар Інстытута мовы і літаратуры імя Якуба Коласа і Янкі Купалы Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі Аляксандр ЛУКАШАНЕЦ**, шмат чаго могуць зрабіць айчынныя СМІ, у тым ліку радыё і тэлебачанне. У прыватнасці, усе прысутныя пагадзіліся з тым, што вельмі важна, каб хоць адзін з беларускіх каналаў, «Беларусь-1» ці «Беларусь-2», пачаў вяшчаць цалкам па-беларуску.

— Вялікую ролю ў пашырэнні беларускай мовы сярод беларусаў можа адыграць і «Звязда», — выказаў пазіцыю Беларускага славянскага камітэта Сяргей Касцян. — Цудоўна было б, калі б яна стала настольнай газетай кожнай беларускай сям'і! Калі грамадзяне будуць штодзённа чытаць пабеларуску, то з цягам часу і думаць пачнуць па-беларуску, а затым і размаўляць.

Аўтарытэт беларускай мовы таксама значна павысіцца, калі ёй станут карыстацца вядомыя, аўтарытэтныя і паспяховыя людзі, лічыць Аляксандр Лукашанец. І тут прадстаўнікам беларускіх міністэрстваў варта браць прыклад з міністра культуры Беларусі. Дарэчы, пакуль што гэта, бадай, адзінае міністэрства, дзе справаводства пераведзена на родную мову.

— Сапраўды, сёння ў важнейшых сферах ужытку беларуская мова выкарыстоўваецца сімвалічна, — адзначыў дырэктар Інстытута мовы і літаратуры імя Якуба Коласа і Янкі Купалы. — Але, разам з тым, у апошнія гады, што радуе, яна пачала пранікаць у інтэрнэт, каталіцкі касцёл, праваслаўную царкву. 20 гадоў таму ў сферы набажэнства беларуская мова фактычна не прысутнічала. Сёння ж гэта вельмі важная сфера духоўнага жыцця сучаснага беларускага грамадства фарміруе прэстыж беларускай мовы.

У бліжэйшы час Беларускі славянскі камітэт разам з зацікаўленымі асобамі паабяцаў распрацаваць свае прапановы па папулярызацыі і пашырэнні сферы выкарыстання беларускай мовы ў жыцці грамадства. Але кожны, як мне бачыцца, ужо сёння можа зрабіць крок насустрач роднай мове. Ну хоць бы ўсталяваць беларускі інтэрфейс на сваім камп'ютары, узяць у бібліятэцы кнігу на беларускай мове альбо падпісацца на беларускамоўную газету.

**Надзея ДРЫЛА.**

**УСТАНОВА «РЭДАКЦЫЯ ГАЗЕТЫ «ЗВЯЗДА» ПРАПАНУЕ АДКАЗАЦЬ НА ПЫТАННІ АНКЕТЫ**

**1. Узрост**..............................................
**2. Месца жыхарства.**..............................................
**3. Прафесія** ..............................................
**4. Інтарэсы, захапленні**..............................................
..............................................
**5. Вы чытаеце «Звязду» ў папяровым варыянце або ў інтэрнэце (падкрэсліце)?**
**6. Вы чытаеце «Звязду» рэгулярна або час ад часу (падкрэсліце)?**
**7. Якая тэматыка, на Ваш погляд, найбольш цікава асвятляецца ў газеце?** ..............................................
..............................................
..............................................
**8. Публікацыям якой тэматыкі аддаяце перавагу асабіста Вы?**
..............................................
..............................................
**9. Якім накірункам газета ўдзяляе недастатковую ўвагу?**
..............................................
**10. Матэрыялы на якія тэмы Вам хацелася б пачытаць у «Звяздзе»?**..............................................
..............................................
**11. Сайт «Звязды»: што падабаецца, што не? Якія змяненні варта зрабіць для паляпшэння работы сайта?**..............................................
..............................................
..............................................
**12. «Калі б журналістам газеты быў(ла) я, то абавязкова напісаў(ла) бы пра…» (пра што?)** ..............................................
..............................................

**КПУП «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) извещает о проведении 23 января 2012 года открытого аукциона по продаже имущества в 11-00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20, кабинет 2-16**

| № лота | Наименование объекта | Адрес объекта | Продавец | Краткая характеристика объекта | Начальная цена продажи, бел. руб. | Сумма задатка, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | **Помещение неустановленного назначения, инв. № 350/D-181635, площадью 258,7 кв.м** | г. Гомель, ш. Речицкое, 135 б, пом. 2 | Комиссия по работе с имуществом, обращенным в доход государства при администрации Советского района г. Гомеля. | Изолированное помещение в одноэтажном панельном здании, перекрытие железобетонное, электроосвещение, отопление | **493 942 000** | **10 000 000** |

**Шаг аукциона -5 %.** К участию в аукционе допускаются лица, которые своевременно подали заявления на участие в аукционе по форме, определенной организатором аукциона, внесли в установленном порядке задаток для участия в аукционе, представили другие необходимые документы и подписали соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.

Документы на участие в аукционе принимаются по адресу: **г. Гомель, ул. Гагарина, 20, каб. 2-16** в рабочие дни с 09-00 до 13-00 и с 14-00 до 17-00 от даты опубликования настоящего извещения **по 19 января 2012 г. включительно**. **Для участия в аукционе в адрес Организатора аукциона необходимо представить:**

1. Заявление на участие в аукционе; 2. Копию платежного поручения о внесении задатка, заверенную банком; 3. Организациям – резидентам Республики Беларусь – доверенность представителю организации (кроме случаев, когда организацию представляет ее руководитель), копии учредительных документов и свидетельства о государственной регистрации (копию документа о создании организации, если она не подлежит государственной регистрации), заверенные юридическим лицом; 4. Индивидуальным предпринимателям – свидетельство о государственной регистрации; 5. Представителям физических лиц – резидентов Республики Беларусь – нотариально заверенную доверенность; 6.Организациям – нерезидентам Республики Беларусь – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть проведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) или иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; 7. Организациям и физическим лицам – нерезидентам Республики Беларусь – документ о состоятельности, выданный обслуживающим его банком или иной кредитно-финансовой организацией с заверенным в установленном порядке переводом на белорусский (русский) язык; 8. Представителям организаций и физических лиц – нерезидентов Республики Беларусь – легализованную в установленном порядке доверенность. При подаче документов на участие в аукционе физические лица, представители физических и юридических лиц предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность. В случае отсутствия у физического лица расчетного счета необходимо открыть текущий расчетный банковский счет в любом банке РБ.

В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником, предмет аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов, при этом данный участник аукциона приравнивается к победителю аукциона. Победитель торгов обязан: подписать протокол о результатах аукционных торгов; согласно счету-фактуре, выписанному организатором аукциона, возместить затраты на организацию и проведение аукциона, оплата которого осуществляется в течение 3 рабочих дней со дня проведения аукциона; оплатить приобретаемое имущество в срок.

**Задаток для участия в аукционе перечисляется на расчетный счет. Р/с № 3012209370018 в филиале ОАО «Белагропромбанк» Гомельское областное управление, код 912, ОКПО 02975763, УНП 400071204.**

Дополнительная информация по телефонам организатора аукциона: 8 (0232) 74-17-34, 74-89-64 и на сайте gomeloblreklama.by

**ИНФОРМАЦИЯ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА БЕЗ УСЛОВИЙ ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА, ОБРАЩЕННОГО В ДОХОД ГОСУДАРСТВА**

| ЛОТ № 1 | |
|---|---|
| **Адрес объекта и его наименование** | - корпус 16Б (инв. № 16-00044), общей площадью 1216,1 м$^2$, год постройки 1987, двухэтажное здание, стены кирпичные, перекрытия ж/б. Объект расположен по адресу: Минская обл., г. Молодечно, ул. В.Гостинец, 67. **Начальная цена: 803 250 000 белорусских рублей.** Шаг аукциона в размере 5% от предыдущей цены. |
| **Порядок оплаты** | Оплата в размере цены продажи объекта (за вычетом задатка) в течение 2 месяцев и 25 дней на р/с СИКУП «УКС-Сервис» |
| **Сумма задатка** | 10 % от начальной цены на р/с 3012190930030 в отделении 932 ОАО «Белинвестбанк», г. Молодечно, код 739, УНН 600182305, ОКПО 04064333, получатель: СИКУП «УКС-Сервис» |
| **Продавец** | Комиссия по работе с имуществом, обращенным в доход государства при Молодечненском райисполкоме |
| **Организатор аукциона** | СИКУП «УКС-Сервис» |
| **Документы, представляемые для участия в аукционе** | Заверенную банком копию платежного документа, подтверждающего внесение задатка; юридическим лицам – копию учредительных документов и свидетельства о регистрации, индивидуальным предпринимателям – нотариально заверенное свидетельство о государственной регистрации, физическим лицам – паспорт или иной документ, удостоверяющий личность. |
| **Конечный срок и адрес приема заявок** | **05.01.2012 г. до 16.00,** г. Молодечно, ул. Мира, 15, каб. 1, СИКУП «УКС-Сервис», тел.: (8 0176) 73 00 13, (факс) 75 19 20, 8 044 710 74 60 |
| **Дата, время и место проведения аукциона** | **06.01.2012 г. в 15.00**, г. Молодечно, ул. Мира, 15, каб. 1. СИКУП «УКС-Сервис» |

**Минский районный исполнительный комитет 20 января 2012 г. проводит открытый аукцион по продаже земельных участков в частную собственность граждан Республики Беларусь в Минском районе**

| № лота | Адрес земельного участка | Кадастровый номер | Площадь земельного участка | Целевое назначение | Расходы по подготовке документации (рублей) | Начальная цена земельного участка (рублей) | Задаток (рублей) |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Мачулищанский п/с, д. Александрово, участок № 1 | 623675200501000077 | 0,1000 га | Для строительства и обслуживания жилого дома | 1 711 330 | 101 000 000 | 10 100 000 |
| 2 | Мачулищанский п/с, д. Александрово, участок № 2 | 623675200501000079 | 0,1518 га | Для строительства и обслуживания жилого дома | 1 601 230 | 153 000 000 | 15 300 000 |
| 3 | Мачулищанский п/с, д. Александрово, участок № 3 | 623675200501000078 | 0,0990 га | Для строительства и обслуживания жилого дома | 1 362 310 | 100 000 000 | 10 000 000 |
| 4 | Самохваловичский с/с, д. Василевщина | 623686301601000067 | 0,1240 га | Для строительства и обслуживания жилого дома | 1 529 000 | 25 000 000 | 2 500 000 |
| 5 | Самохваловичский с/с, д. Слобода, участок № 175 | 623686304601000580 | 0,1255 га | Для строительства и обслуживания жилого дома | 1 529 000 | 40 000 000 | 4 000 000 |
| 6 | Сеницкий с/с, д. Копиевичи, участок № 1 | 623686602101000108 | 0,2500 га | Для строительства и обслуживания жилого дома | 2 326 740 | 202 000 000 | 20 200 000 |
| 7 | Сеницкий с/с, д. Копиевичи, участок № 2 | 623686602101000109 | 0,1500 га | Для строительства и обслуживания жилого дома | 1 530 730 | 122 000 000 | 12 200 000 |
| 8 | Сеницкий с/с, аг. Прилуки, ул. Озерная | 623686604601000356 | 0,1000 га | Для строительства и обслуживания жилого дома | 2 229 870 | 83 000 000 | 8 300 000 |
| 9 | Сеницкий с/с, д. Скориничи, участок № 47 | 623686606101000213 | 0,1376 га | Для строительства и обслуживания жилого дома | 1 258 600 | 56 000 000 | 5 600 000 |

Аукцион состоится по адресу: г. Минск, ул. Ольшевского, д. 8. Дата проведения: **20.01.2012 г. в 9.45.** Заявления на участие и необходимые документы принимаются с 8.00 до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Ольшевского, д. 8, к. 416. Окончание приема заявлений и документов: **16.01.2012 г. в 17.00.** Контактный телефон: 204 11 62.

Задаток за участие в аукционе на Лоты 1–3 перечисляется на расчетный счет № 3641621080042 ГУ МФ РБ по Минской области, филиал № 614 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, ул. Червякова, 2, код 520, УНП 600452694, код платежа – 04901.

На Лоты 4–5 перечисляется на расчетный счет № 3641900000088 ГУ МФ РБ по Минской области, филиал № 614 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, ул. Червякова, 2, код 520, УНП 600052424, код платежа – 04901.

На Лоты 6–9 перечисляется на расчетный счет № 3641900000134 ГУ МФ РБ по Минской области, филиал № 614 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, ул. Червякова, 2, код 520, УНП 600052409, код платежа – 04901.

К участию в аукционе допускаются физические лица, подавшие в комиссию в указанные сроки соответствующее заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в объявлении расчетный счет задаток (задатки) в размере, порядке и сроки, определенные в извещении.

Граждане, желающие участвовать в аукционе в отношении нескольких земельных участков, вносят задатки в размере, установленном для каждого из этих земельных участков.

Документы, необходимые для участия в аукционе:

1. Заявление на участие в аукционе с указанием кадастровых номеров и адресов земельных участков.

2. Заверенные банком копии платежных поручений о внесении задатка на расчетный счет.

3. Гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования (ксерокопия паспорта);

3.1 представителем гражданина – нотариально удостоверенная доверенность.

При подаче документов на участие в аукционе граждане Республики Беларусь предъявляют паспорт гражданина Республики Беларусь, а представители граждан – документ, удостоверяющий личность.

Все желающие могут ознакомиться с документацией и земельными участками в соответствующем сельисполкоме.

Аукцион признается несостоявшимся в случаях, если: ни один из участников аукциона после трехкратного объявления первой объявленной цены не поднял аукционный номер; ни один из участников аукциона в соответствии с решением комиссии не был признан победителем; заявление об участии в аукционе подано менее чем двумя участниками аукциона (в этом случае местный исполнительный комитет в течение 10 рабочих дней после признания аукциона несостоявшимся принимает решение о предоставлении единственному участнику земельного участка в частную собственность. В течение 10 рабочих дней со дня принятия указанного решения гражданин обязан внести плату за земельный участок в размере его начальной цены, увеличенной на 5 %, возместить расходы, связанные с подготовкой аукциона и документации, необходимой для его проведения, и выполнить условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона).

Местный исполнительный комитет в течение 10 рабочих дней после утверждения протокола о результатах аукциона принимает решение о предоставлении победителю аукциона земельного участка. Внесение платы за предмет аукциона и возмещение затрат на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения, осуществляются в установленном порядке победителем аукциона в течение 10 рабочих дней со дня принятия местным исполнительным комитетом решения о предоставлении победителю аукциона земельного участка. Местный исполнительный комитет не позднее 2 рабочих дней после внесения победителем аукциона платы за предмет аукциона, возмещения затрат на организацию и проведение аукциона, в том числе расходов, связанных с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения и выполнения условий, предусмотренных в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона, выдает ему выписку из решения о предоставлении земельного участка в частную собственность.

# ПЛАЦДАРМ

Сумесны праект рэдакцыі газеты «Звязда» і Міністэрства абароны Рэспублікі Беларусь

Выпуск № 8 (8)



Адкрытая пляцоўка для захавання тэхнікі.

# БАЗА РЭЗЕРВУ ТАНКАЎ

## Ніколі б не падумала, што калі-небудзь апынуся ў... танку

**Не ў муляжы, не ў пустым каркасе, які застаўся з часоў Вялікай Айчыннай і цяпер з'яўляецца музейным экспанатам, а менавіта ў сапраўдным баявым танку. Аднак журналісцкая праца тым і выдатная, што дае шанц пабываць там, куды не кожны трапіць. Т-72 можна без перабольшання назваць самым папулярным танкам. Сёння ён знаходзіцца на ўзбраенні ў многіх краінах свету, у тым ліку і ў нас.**

І адзін асобны танк зблізку ўражвае сваімі памерамі, а калі іх шмат, ды яшчэ расстаўленых роўнымі шарэнгамі... Такое відовішча сапраўды захапляе. Магутныя машыны нагадваюць міфічных волатаў-ваяроў, якія сталі плячо ў плячо на абарону Айчыны. Пабачыць такое мне пашчасціла ў 969-й базе рэзерву танкаў, што ў 40 км ад Слуцка.

### Падфарбаваць, ачысціць, праверыць на дзеяздольнасць

Апроч непасрэдна танкаў, тут захоўваюцца БТРы (бронетранспарцёры), БМП (баявыя машыны пяхоты), БРДМы (браніраваныя разведвальна-дазорныя машыны), БМД (баявыя машыны дэсанту), БРЭМы (браніраваныя рамонтна-эвакуацыйныя машыны) і іншыя машыны, якія паступаюць на базу з усіх куткоў краіны.

Недасведчаным патлумачу, што работнікі базы не з'яўляюцца членамі экіпажаў бранятанкавай тэхнікі. Перад імі пастаўлена іншая задача: прыняць тэхніку, абслужыць (падфарбаваць, пачысціць, праверыць яе на дзеяздольнасць), паставіць на захаванне, рэгулярна праводзіць тэхнічны агляд. Пры гэтым нейкай «сезоннасці» ў рабоце базы няма: абарачэнне тэхнікі ажыццяўляецца незалежна ад пары года.

Асабіста мне, як цывільнаму журналісту і дзяўчыне, было цікава даведацца, што ў танку (як і ў іншай бранятанкавай тэхніцы) за асобныя яго элементы адказваюць розныя спецыялісты. Напрыклад, за гарматы і кулямёты — кіраўнік службы ракетна-артылерыйскага ўзбраення, за браню — начальнік бранятанкавай службы, за радыёсувязь — начальнік службы сувязі і г.д. Мне гэта нагадала ўрачоў у паліклініцы — адзін лечыць вочы, другі — вуха, горла і нос, трэці — зубы.

— Камандзір падраздзялення адказвае за ўсё, што ёсць у машыне, — удакладніў намеснік камандзіра часці, маёр Васіль Яўгенавіч Гарошка, — і за гарматы, і за радыёстанцыі, і за рухавік... за кожны болцік. Усе профільныя службы працуюць на абслугоўванні бранятанкавай тэхнікі.

Калектыў у нас з'яднаны. Доля салдат тэрміновай службы зусім невялікая, аснову асабовага саставу складаюць афіцэры і прапаршчыкі (ёсць і цывільны персанал). Менавіта рукамі гэтых людзей і выконваецца ўся праца на базе. А яе хапае. Увогуле, хацеў бы падкрэсліць, што ў нас працуюць выдатныя спецыялісты ў сваёй галіне, не толькі з ліку ваеннаслужачых, але і цывільнага персаналу.

Нашы афіцэры і прапаршчыкі рэгулярна бяруць удзел у ваенных парадах — толькі яны маюць права кіраваць гістарычнымі баявымі танкамі, якія захаваліся з часоў Вялікай Айчыннай вайны.

> **Даведка «Звязды»:**
>
> *969-я база рэзерву танкаў была ўтворана 29 лістапада 1946 года. Месца дыслакацыі — гарадскі пасёлак Урэчча (40 км ад Слуцка, Мінская вобласць). З 1950 па 1960 г. база падпарадкоўвалася начальніку галоўнага бранятанкавага ўпраўлення Узброеных Сіл СССР. З верасня 1960-га перададзена ў склад войскаў Беларускай ваеннай акругі.*
>
> *За свае высокія паказчыкі ў баявой падрыхтоўцы база неаднойчы ўзнагароджвалася пераходзячым вымпелам і пераходзячым Чырвоным Сцягам Ваеннага Савета Беларускай ваеннай акругі, а ў 1983 годзе пераходзячы Чырвоны Сцяг быў пакінуты тут на вечнае захаванне.*
>
> *Сіламі спецыялістаў 969-й базы рэзерву танкаў была праведзена рэстаўрацыя бранятэхнікі часоў Вялікай Айчыннай вайны, якая стала неад'емным атрыбутам ваенных парадаў.*

> **ЦІКАВЫ ФАКТ:**
>
> **Слова «танк» паходзіць ад англійскага tank, што значыць «бак», «цыстэрна», «рэзервуар». Пры адпраўцы на фронт першых танкаў брытанская контрразведка пусціла чуткі, што ў Англіі расійскім урадам заказана партыя паліўных цыстэрнаў. І танкі адпраўляліся чыгункай пад відам цыстэрнаў (гіганцкія памеры і форма першых танкаў выдатна адпавядалі гэтай версіі). На іх нават напісалі па-руску «Осторожно. Петроград». Назва прыжылася.**
>
> **Адметна, што ў Расіі новую баявую машыну першапачаткова называлі «лохань» (яшчэ адзін варыянт перакладу слова tank).**



Абслугоўванне бранятанкавага ўзбраення.

### Даніна традыцыі ці рэальная баявая сіла?

— Пераважная большасць танкаў, якія цяпер размяшчаюцца на нашай базе, знаходзяцца ў спраўным стане і прыдатныя для выкарыстання па прамым прызначэнні, — расказаў начальнік штаба, першы намеснік камандзіра вайсковай часці Сяргей Уладзіміравіч Адамовіч. — Ёсць у нас і тэхніка, якая захоўваецца на базе ў чаканні рамонту, але яе значна менш.

Мы — адзіная такая вайсковая часць на тэрыторыі краіны. Падобных да нас у Беларусі не існуе, ды ў іх і няма неабходнасці, бо мы спраўляемся з захаваннем усіх запасаў бранятанкавага ўзбраення і тэхнікі Узброеных Сіл.

Карыстаючыся выпадкам, я не магла не пацікавіцца ў Сяргея Уладзіміравіча яго думкай наконт таго, ці застаўся сёння танк сучасным відам баявой тэхнікі. Мо танкавыя войскі — гэта хутчэй даніна традыцыі, чым рэальная баявая сіла?

— Назіраючы за тымі лакальнымі ваеннымі канфліктамі, якія адбываюцца ў розных кутках свету, можна заўважыць, што танкі не перасталі прымяняцца. Ніводная краіна ад іх цалкам не адмовілася. Больш за тое, працягваюцца навуковыя распрацоўкі па далейшым удасканаленні танкаў і танкавага ўзбраення. Таму сказаць, што танк як від зброі тэхнічна і маральна састарэў, я не магу. Ён усё роўна застанецца запатрабаваным, паколькі з'яўляецца асноўнай бранявой і ўдарнай сілай.

Асноўнымі баявымі якасцямі танка з'яўляюцца абароненасць, манеўранасць, рухомасць. Імі валодаюць усе танкі, што знаходзяцца ў нас на ўзбраенні, галоўнае — умець правільна і эфектыўна прымяніць гэтыя якасці ў баю.

> **ЦІКАВЫ ФАКТ:**
>
> **Рашэнне аб вытворчасці танкаў было прынята ў 1915 годзе практычна адначасова ў Вялікабрытаніі, Францыі і Расіі. Канчаткова першая англійская мадэль танка была гатовая ў 1916 годзе, калі прайшла выпрабаванні, і першы заказ на 100 машын паступіў у вытворчасць. Гэта быў танк Mark-1 — даволі недасканалая баявая машына, якая выпускалася ў дзвюх мадыфікацыях — «самец» (з гарматным узбраеннем) і «самка» (толькі з кулямётамі).**

Танк лічыцца калектыўнай зброяй. Яго экіпаж складаецца з трох чалавек (камандзіра, наводчыка і механіка-вадзіцеля). Пры адсутнасці любога з членаў экіпажа выконваць баявыя задачы танку будзе праблематычна, а часам і проста немагчыма.

Большасць бранятанкавай тэхнікі, якая сёння знаходзіцца ў нас на ўзбраенні, была выраблена яшчэ пры Саюзе, аднак назваць яе маральна састарэлай будзе няправільна, падкрэсліў Сяргей Уладзіміравіч.

— Танк — дастаткова надзейная машына, у якую пры стварэнні закладваецца вялікі запас трываласці. Нашы танкі цалкам адпавядаюць сучасным патрабаванням да вядзення бою. Не трэба забывацца, што многае залежыць ад экіпажа. Калі ў машыне будзе знаходзіцца разумны, граматны экіпаж, то і на Т-34, які ваяваў у Вялікую Айчынную, сёння можна весці паспяховыя ваенныя дзеянні. Улічыце яшчэ, што савецкая навука знаходзілася ў авангардзе танкабудаўніцтва і значна апярэджвала астатнія краіны, і што ўсё новае — гэта дапрацаваныя і мадэрнізаваныя базавыя мадэлі.

У Беларусі танкі з'яўляюцца адным з асноўных магутных відаў баявой тэхнікі, што знаходзіцца на нашым узбраенні. Гэта своеасаблівы механізм стрымлівання — моцных трэба паважаць.

Па словах начальніка штаба, галоўнае прынцыповае адрозненне танкаў часоў Вялікай Айчыннай ад сучасных — «электронная» начынка. Лічбавыя тэхналогіі сёння актыўна прымяняюцца не толькі ў вытворчасці танкаў, але і ўсіх іншых відаў бранятанкавага ўзбраення. Гэта аблягчае работу экіпажа, хоць і патрабуе больш высокага ўзроўню яго падрыхтоўкі.

— Мы — вайсковая часць тэхнічнага забеспячэння. Наша задача — захаваць тэхніку і падтрымліваць яе ў спраўным стане, — падкрэсліў у канцы размовы Сяргей Адамовіч. — Аднак мы клапоцімся не толькі пра машыны, але і пра свой калектыў. Сёлета шмат што ў нас зроблена для паляпшэння якасці ўмоў пражывання і працы людзей на базе. Мы робім усё для таго, каб нашы людзі — і ваеннаслужачыя, і грамадзянскі персанал — з задавальненнем прыходзілі на працу.

**Інга МІНДАЛЁВА.**

*Мінская вобласць.*

## Весткі з Ваеннай акадэміі

### НОВЫ ЭКСПАНАТ МУЗЕЯ — «ЗБРОЯ ПЕРАМОГІ»

**Гісторыя ракетных войскаў і артылерыі адметная сваімі багатымі традыцыямі.**

У гады Вялікай Айчыннай вайны артылерыя ва ўсіх асноўных франтавых і стратэгічных аперацыях зрабіла значны ўнёсак у разгром груповак праціўніка. Магутнасцю артылерыі пачалося легендарнае контрнаступленне нашых войскаў пад Сталінградам, якое канчаткова пераламала ход вайны. Неўміручай славай пакрылі сябе воіны-артылерысты пры вызваленні Беларусі.

У гады вайны савецкая артылерыя была страшнай пагрозай для ворага з першых памежных бітваў да самы пераможных дзён. У ходзе ваенных дзеянняў артылерыя расла і колькасна, і якасна. За гады вайны былі створаны і прыняты на ўзбраенне новыя, больш эфектыўныя гарматы, гаўбіцы, мінамёты і рэактыўныя ўстаноўкі.

Бранятанкавая служба Ваеннай акадэміі, якую ўзначальвае маёр Аляксандр Марухін, падрыхтавала новы экспанат «зброя Перамогі» для музея ўзбраення і ваеннай тэхнікі Ваеннай акадэміі Беларусі — гэта самаходна-артылерыйская ўстаноўка перыяду Вялікай Айчыннай вайны ІСУ-152. У бліжэйшы час яна будзе выстаўлена на ўсеагульны агляд.

У назве машыны абрэвіятура ІСУ азначае «самаходная ўстаноўка на базе танка ІС», індэкс 152 — калібр асноўнага ўзбраення машыны, што прынята на ўзбраенне 6 лістапада 1943 года. ІСУ-152 шырока прымяняліся на завяршальным этапе Вялікай Айчыннай вайны практычна ва ўсіх аспектах выкарыстання самаходнай артылерыі і адыгралі важную ролю ў разгроме нацысцкай Германіі і яе саюзнікаў. Акрамя Савецкага Саюза, ІСУ-152 знаходзіліся на ўзбраенні войскаў Польшчы і Чэхаславакіі, адзінкавыя трафейныя машыны выкарыстоўваліся вермахтам і войскам Фінляндыі.

У пасляваенны перыяд ІСУ-152 прайшлі мадэрнізацыю і доўга знаходзіліся на ўзбраенні. Яны таксама пастаўляліся для аснашчэння егіпецкіх узброеных сіл. Перададзеныя Егіпту самаходкі бралі ўдзел у араба-ізраільскіх узброеных канфліктах на Блізкім Усходзе. Пачынаючы з сярэдзіны 70-х гадоў, ІСУ-152 былі зняты з узбраення Савецкай Арміі і заменены больш сучаснымі САУ. Некаторая колькасць ацалелых ад разразання на метал машын цяпер служыць помнікамі і экспанатамі ў музеях розных краін свету.

**Ігар ШАЛУДКОЎ.**

### ПЕДАГАГІЧНАЯ ПСІХАЛОГІЯ — У ПАДРЫХТОЎЦЫ АФІЦЭРСКІХ КАДРАЎ



**Вучоная ступень «кандыдат псіхалагічных навук» прысвоена старшаму афіцэру цэнтра прафесійнага псіхалагічнага адбору і суправаджэння навучальна-выхаваўчага працэсу Ваеннай акадэміі Рэспублікі Беларусь маёру Аляксандру Ціцкаму.**

Нарадзіўся Аляксандр Генадзьевіч у 1980 годзе ў Мар'інай Горцы ў сям'і ваеннаслужачага. Пасля заканчэння Ваеннай акадэміі па спецыяльнасці «Маральна-псіхалагічнае забеспячэнне воінскай дзейнасці» быў накіраваны для далейшага праходжання службы ў асобны 334-ы танкавы батальён 120-й амбр на пасаду псіхолага батальёна. Далей — служба ў галоўнай ваеннай ВНУ курсавым афіцэрам агульнавайсковага факультэта і старшым афіцэрам цэнтра прафесійнага педагагічнага адбору і суправаджэння вучэбна-выхаваўчага працэсу. Скончыў аспірантуру (завочна) на кафедры педагагічнай псіхалогіі Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя Максіма Танка.

Дысертацыйная работа маёра Ціцкага прысвечана адной з найбольш актуальных праблем педагагічнай псіхалогіі — уліку індывідуальна-своеасаблівага складу розуму навучэнца. Пачынаючы сваё даследаванне, ён кіраваўся, у першую чаргу, яго практычнай важнасцю ў галіне падрыхтоўкі афіцэрскіх кадраў для Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь.

Вынікі праведзенага даследавання дазваляюць больш поўна рэалізаваць асобасна-арыентаваны падыход у сістэме ваеннай адукацыі і тым самым павысіць узровень падрыхтоўкі ваенных кадраў.

**Наталля ЛЯДНЁВА. Фота аўтара.**

### ЛЕПШЫЯ — У ПЕЦЯРБУРГУ

**Штогод на падставе маніторынгу паспяховасці навучальных груп Ваеннай акадэміі, дзе за аснову бярэцца сярэдні бал курсантаў на зімовай і летняй экзаменацыйных сесіях, а таксама стан воінскай дысцыпліны і ўдзел у вучэбнай і навуковай рабоце, вызначаецца лепшая вучэбная група. Гэта адна з падзей, якую курсанты заўсёды чакаюць з нецярплівасцю. Толькі лепшыя ў якасці заахвочвання атрымліваюць запаветную экскурсійную паездку.**

Па выніках 2010/11 навучальнага года лепшай была прызнаная 756-я вучэбная група авіяцыйнага факультэта. На працягу ўсяго перыяду навучання цяперашнія пяцікурснікі, якія вучацца па спецыяльнасці «Эксплуатацыя паветранага транспарту, кіраванне паветраным рухам (армейская авіяцыя)», паказвалі стабільна высокія вынікі.

У гэтай групе праходзяць навучанне пяць будучых афіцэраў-верталётчыкаў — Канстанцін Аўчыннікаў, Аляксей Марозаў, Міхаіл Вернікоўскі, Дзяніс Аўдзееў і Сяргей Лучанок. Усе яны — выдатнікі вучобы і, што асабліва паказальна, з'яўляюцца прадаўжальнікамі сямейнай традыцыі. Па прыкладзе сваіх бацькоў яны вырашылі стаць афіцэрамі беларускага войска. Курсанты ганарацца абранай прафесіяй і лічаць яе справай для сапраўдных мужчын.

Трэба сказаць, што сёлета хлопцам пашанцавала ўдвая, таму што для паездкі ў іх на выбар былі два гарады — Кіеў і Санкт-Пецярбург. Аднагалосна прагаласавалі за культурную сталіцу Расіі.

Сярод удзельнікаў падарожжа — лепшы слухач камандна-штабнога факультэта падпалкоўнік Алег Кавалёў з жонкай Тацянай, лепшы выкладчык акадэміі Інга Івашчанка з сынам Мікітам. Старшым групы быў начальнік 5-га курса авіяцыйнага факультэта капітан Расціслаў Пракапенка.

«Нікому не верылася, што столькі эмоцый і такую вялізную колькасць уражанняў мы атрымалі ўсяго за двое сутак знаходжання ў Пецярбургу. Кожнаму з нас здавалася, што мінуў, як мінімум, тыдзень — столькі ўсяго мы ўбачылі і даведаліся!» — расказваюць хлопцы. Яны ўпэўнены, што іх паездка стане добрым стымулам у вучобе для ўсіх астатніх навучальных груп ваеннай ВНУ.

**Наталля ЛЯДНЁВА.**

# «ТАКАЯ Ў ДЭСАНТНІКАЎ РАБОТА!»

**У 38-Ю АСОБНУЮ гвардзейскую Венскую Чырвонасцяжную мабільную брыгаду прыбыло маладое папаўненне. Каля паўтысячы юнакоў, учарашніх школьнікаў, паступова асвойваюць нялёгкае армейскае жыццё. Вельмі важны момант у жыцці кожнага дэсантніка — першы скачок з парашутам. Да яго ўжо рыхтуюцца навічкі.**

Можа так стацца, што першы скачок давядзецца здзейсніць нават да прысягі, але не раней за той час, калі кожны салдат будзе поўнасцю падрыхтаваны да гэтага выпрабавання фізічна і маральна.

Заняткі пачынаюцца ў спартыўнай зале, дзе будучыя воіны вучацца правільна складваць парашут. Гэта пачатак усіх пачаткаў: не варта гаварыць, да якіх наступстваў у паветры прывядзе памылка ў падрыхтоўцы баявога аснашчэння. Таму хлопцы ў форме і ў дзясяты, і ў дваццаты раз складваюць непаслухмянае палатно, пакуль яно не будзе ляжаць так, як трэба. Пры гэтым навыкі трэба замацаваць ледзь не да аўтаматызму, каб рукі памяталі, куды які рог загортваць.

Навучыліся складваць — далейшая трэніроўка праходзіць на вуліцы. На спецыяльных трэнажорах пад наглядам сваіх камандзіраў байцы праходзяць усе этапы скачка. Кажуць, што практыкаванні на некаторых прыстасаваннях нават цяжэйшыя, чым рэальны скачок. Але дэсантніку не павінна быць цяжка ў вучэнні, ён мусіць умець валодаць сваімі эмоцыямі, заглушаць многія пачуцці, прымальныя ў звычайным жыцці грамадзянскага чалавека. Усяму гэтаму паступова навучаць навічкоў у іх новым армейскім калектыве.



У часці з 1 снежня пачаўся вучэбны год. Як расказаў намеснік камандзіра па ідэалагічнай рабоце гвардыі падпалкоўнік Уладзімір Юргель, сёлета ссунуліся тэрміны прызыву, таму і пачатак новага навучальнага года прыпаў на снежань. Салдаты займаюцца па раскладзе ў класах, як і любыя навучэнцы. Спачатку засвойваюць тэарэтычныя веды па сваіх спецыяльнасцях. Трэніруюцца на палігоне, на вучэбных палях, праходзяць страявую падрыхтоўку. Паступова ўзрастаюць нагрузкі і тэрмін знаходжання ў палявых умовах. У залежнасці ад падраздзяленняў і спецыяльнасцяў байцы праходзяць вучэбныя зборы ў полі па 3-5, 5-7,10 сутак, двухтыднёвыя, бывае, што асобнае падраздзяленне становіцца лагерам і жыве ў палявых умовах да месяца. Але ўсё гэта ў навабранцаў будзе крышку пазней, пасля таго, як яны прымуць прысягу на зямлі Брэсцкай крэпасці. І там ужо паўнапраўныя байцы, абаронцы Айчыны, абнімуць сваіх мам, што будуць цярпліва чакаць з дамашнімі пірагамі і ўсялякай смакатой.

Прысяга па традыцыі праходзіць у крэпасці, дзе маладыя воіны могуць дакрануцца душой да подзвігу яе абаронцаў. А ў часці ёсць добры музей. Там можна азнаёміцца з багатай гісторыяй брыгады, даведацца, чаму да яе назвы дадаецца слова «Венская». Справа ў тым, што 105-я гвардзейская стралковая дывізія, якая пазней была ператворана ў 38-ю брыгаду, вызваляла Вену ў 1945 годзе. Восем дзён ішлі жорсткія баі за горад. Байцы 105-й прадэманстравалі масавую адвагу і гераізм. Чатыры чалавекі за гэту аперацыю атрымалі ордэн Леніна, 75 — ордэн Чырвонага Сцяга, 541 — ордэн Чырвонай Зоркі, 2091 узнагароджаны медалямі. А сама дывізія атрымала ганаровую назву Венская. Да нядаўняга часу самым жаданым госцем у брыгадзе быў франтавік, камандзір аддзялення стралковага батальёна 105-й дывізіі Яўген Аляксандравіч Самойлаў. Сённяшняй моладзі, на жаль, можна паказаць толькі мемуары ветэрана і шматлікія фотаздымкі.

(Заканчэнне на 4-й стар.)




# Ваенная журналістыка пад сцягам БДУ: РАЗВІЦЦЁ З ХУТКАСЦЮ ПРАГРЭСУ!



Фота Аляксандра ГАНЧАРОВА.

Малодшы сяржант Яўген ДОЎГАЛЬ (на фота)

**У аўдыторыях Інстытута журналістыкі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта можна сустрэць маладых людзей у прыгожай вайсковай форме — курсантаў, якія разам са студэнтамі журфака БДУ спасцігаюць азы журналістыкі, толькі з прыстаўкай — «ваенная». Размова пойдзе пра адну з самых прэстыжных і неабходных у сучасную эру інфармацыйных тэхналогій спецыяльнасцяў ва Узброеных Сілах — спецыяльнасць ваеннага журналіста. Гэтая спецыяльнасць была адкрыта ў вядучым ВНУ краіны толькі 7 гадоў таму.**

— Наш ваенны факультэт у Беларускім дзяржаўным універсітэце быў абраны для адкрыцця спецыяльнасці «ваенная журналістыка» таму, што менавіта ў БДУ працуе Інстытут журналістыкі, які валодае найсучаснай вучэбна-матэрыяльнай базай і багатым вопытам падрыхтоўкі журналісцкіх кадраў, які высока цэніцца далёка за межамі Беларусі — гэтая база і выкарыстоўваецца для падрыхтоўкі курсантаў.

(Заканчэнне на 4-й стар.)

# КАМБАТ


Армія ў асобах
Юрый Салавей (у цэнтры) у час спаборніцтваў.

**Камандзір механізаванага батальёна 120-й гвардзейскай асобнай механізаванай брыгады гвардыі падпалкоўнік Юрый Салавей адносіцца да катэгорыі людзей, якія прывыклі ўсяго ў жыцці дамагацца сваімі сіламі. Дапамагаюць яму ў гэтым мэтанакіраванасць, упартасць і моцны характар.**

Па выніках штогадовага спаборніцтва на званне лепшага камандзіра механізаванага батальёна ён быў прызнаны пераможцам.

Па армейскіх мерках 40-гадовага камандзіра батальёна падпалкоўніка Юрыя Салаўя наўрад ці назавеш кар'ерыстам. Прысвяціўшы жыццё ажыццяўленню мары дзяцінства, ён, як спяваецца ў песні, служыў «не за званні і не за ордэны».

*Юрый Салавей нарадзіўся ў 1970 годзе ў Слуцку. Ва Узброеных Сілах з 1988 года. У 1992 годзе скончыў Мінскае вышэйшае ваенна-палітычнае агульнавайсковае вучылішча. Пачынаў афіцэрскую службу з пасады камандзіра ўзвода роты ганаровай варты. У 2008 годзе прызначаны на пасаду камандзіра механізаванага батальёна 120-й гвардзейскай амбр.*

*Жанаты. Мае дваіх сыноў.*

— Пытанне аб выбары будучай прафесіі для мяне ніколі не стаяла, — распавядае Юрый Міхайлавіч. — Колькі сябе памятаю, іншай думкі, акрамя як быць ваенным, не было. Шмат у чым на мой выбар паўплываў бацька — палкоўнік Міхаіл Мікалаевіч. Праз горан афганскай вайны прайшоў і мой дзядзька. На франтах Вялікай Айчыннай ваяваў дзед.

**— Палітрук, як казалі раней, — і на чале механізаванага батальёна? Што вас прывяло ў пяхоту?**

— Пасля заканчэння школы падаў дакументы ў Харкаўскае вышэйшае танкавае каманднае вучылішча — каб быць танкістам, як і бацька. Але перашкодзіў... рост. Бацькі да таго часу, паматаўшыся па Савецкім Саюзе, «аселі» ў Беларусі, таму выбраў Мінскае вышэйшае ваенна-палітычнае агульнавайсковае вучылішча. Для мяне галоўным словам было «ваеннае», грамадзянскія ВНУ я нават не разглядаў.

Першай у маёй афіцэрскай кар'еры стала пасада камандзіра ўзвода роты ганаровай варты, потым служба працягвалася ўжо ў 356-м мотастралковым палку 120-й гвардзейскай мотастралковай дывізіі. Як бачыце, практычна з першых дзён я служыў, так бы мовіць, не па профілі. І пра гэта не шкадую.

**— А ці ёсць тое, пра што шкадуеце?**

— Аднойчы прыйшлося прыняць рашэнне, якое вельмі цяжка далося. Сказаць «шкадую» ў дадзеным выпадку будзе не зусім правільна. У лістападзе 2001 года нашу дывізію перафарміравалі ў механізаваную брыгаду. Як вынік, вялікае скарачэнне. Пытанне ставілася так: хочаце служыць — шукайце сабе месца, не знайшлі — звальняйцеся. Перапрафіляваться ў сувязісты або тылавікі ніякага жадання не было, а пяхотныя пасады адсутнічалі. Я звольніўся па скарачэнні штатаў.

**— Чаму ж зноў сталі ў армейскі строй? Не знайшлі сябе ў грамадзянскім жыцці?**




— Адкажу прама: калі ў чалавека ёсць галава і рукі, ён знойдзе сябе на любой ніве: грамадзянскай, ваеннай або яшчэ якой-небудзь. Тры гады я працаваў сам на сябе. Прабачце за нясціпласць, фінансавых праблем не меў, атрымліваў асалоду ад пачуцця свабоды і адсутнасці якіх-небудзь абавязкаў. Але гэтая эйфарыя праз нейкі час мінула, і я пачаў разумець: чалавек павінен працаваць у калектыве. Стаў перабіраць варыянты працаўладкавання і прыйшоў да высновы, што камфортна магу сябе адчуваць толькі сярод аднадумцаў. Людзей, якія па поглядах, інтарэсах, складзе думак такія ж фанатычна ваенныя, як і я. Маральны камфорт значна больш каштоўны за матэрыяльныя выгады.

Жыццё само расставіла ўсё па месцах, і ў 2005 годзе я зноў пераступіў парог КПП 120-й гвардзейскай асобнай механізаванай брыгады ў якасці намесніка камандзіра танкавага батальёна 339-й механізаванай групы.

**— З якім настроем вы ехалі на спаборніцтвы камбатаў?**

— Сказаць праўду? З кепскім! А які можа быць настрой у чалавека, калі за дзве гадзіны да адпраўлення на спаборніцтвы ён даведваецца, што ў яго выкралі з машыны ўсе чатыры колы?

**— Гэта значыць, стаўку на перамогу вы не рабілі?**

— Я ў жыцці нячаста імкнуся быць першым. Маёй мэтай было — не стаць апошнім. Летась, упершыню беручы ўдзел у падобных спаборніцтвах, я заняў трынаццатае месца з дваццаці. Прайшоўшы ўсе выпрабаванні, зразумеў, што нічога складанага ў іх няма. Гэта тое кола пытанняў і задач, з якімі кожны з нас, так або інакш, сутыкаецца ў службе штодня. Таму на цяперашніх спаборніцтвах паспрабаваў максімальна паказаць, на што здольны, і вынік не прымусіў сябе чакаць. У першы дзень, праўда, адмысловага настрою на перамогу не было, а калі даведаўся, што лідзірую, разгуляўся спартыўны азарт, і перамога стала справай прынцыпу.

**— Матэрыяльны стымул у выглядзе прэміі ў 5 мільёнаў беларускіх рублёў, мусіць, таксама падштурхоўваў наперад?**

— Па-першае, пра грашовую прэмію на той момант ніхто з нас нічога не ведаў, бо ў мінулыя гады пераможца ўзнагароджваўся толькі пераходзячым вымпелам. А па-другое, не палічыце за няшчырасць, для мяне вымпел мае значна большую каштоўнасць, чым прэмія. Бо на ім напісана: «Лепшаму камбату Сухапутных войскаў» і намалявана эмблема гэтага віду войскаў. А заўтра ён ужо можа стаць гісторыяй.

**— Па-за службай які вы чалавек? Ёсць у вас іншыя інтарэсы, акрамя арміі?**

— У 1997 годзе ў адным з кабінетаў віцебскага ваенкамата я ўбачыў калекцыю шаўронаў і кукардаў. Мяне зацікавіла, я захапіўся сігнумаcтыкай. На сёння ў калекцыі каля тысячы нарукаўных, нагрудных нашывак, знакаў адрознення з усіх куткоў свету. Таксама захапляюся мадэляваннем ваеннай тэхнікі.

Але самае сур'ёзнае маё захапленне — алкамінімалістыка. Не, гэта не тое, што вы падумалі. Дарэчы, я заўзяты праціўнік тытуню і алкаголю. Алкамінімалістыка — гэта калекцыянаванне алкагольных міні-бутэлечак, аб'ём якіх не перавышае 50 мл. Самая вялікая калекцыя мініяцюрных бутэлечак, паводле кнігі рэкордаў Гінэса, налічвае больш як 50 тысяч экзэмпляраў. У мяне пакуль іх каля сямісот. Але, як той казаў, усё жыццё яшчэ наперадзе, і хто ведае, можа, калі-небудзь наблізіжуся да сусветнага рэкорду.

**— Самая вялікая страта ў жыцці?**

— Мой бацька. Чалавек, думка якога для мяне вельмі аўтарытэтная, — мой бацька. Ён 27 гадоў аддаў ваеннай службе, у 1990-м звольніўся ў запас у званні палкоўніка. Аднак усвядоміць, што такое жыццё без арміі, не паспеў — памёр праз два гады пасля выхаду на пенсію. Гэта здарылася, калі я толькі надзеў афіцэрскія пагоны. З гэтага моманту я зразумеў, што ўсе рашэнні ў жыцці мне давядзецца прымаць самому, а падтрымка і парада бацькі былі ў той час такія патрэбныя...

**— Хацелі б, каб дзеці паўтарылі ваш лёс?**

— У мяне два сыны. Старэйшаму 19 гадоў, вучыцца ў Мінскім дзяржаўным архітэктурна-будаўнічым каледжы, сур'ёзна захапляецца амерыканскім футболам. Малодшаму 15 гадоў. На пытанне: «Кім будзеш?» маме ён адказвае: «Доктарам». Мяне запэўнівае, што вырашыў паступаць у Ваенную акадэмію. Мусіць, каб нікога не пакрыўдзіць. Так што, мяркуючы па ўсім, стане дыпламатам. А калі сур'ёзна, галоўнае — каб яны людзьмі добрымі былі.

**— Здараецца, некаторыя лейтэнанты спрабуюць пасля першага ж кантракта звольніцца. На вашу думку, гэта маладушнасць, позняе ўсведамленне памылкі ў выбары жыццёвага шляху або нешта іншае?**

— Армія — гэта арганізацыя энтузіястаў. Бо зарплата афіцэраў ва ўсе часы была не самай вялікай. Тут нельга стаць багатым, а можна зарабіць роўна столькі, колькі неабходна на жыццё. Тыя, хто служыць, падпісвае другі, трэці кантракт, для сябе вызначылі: мой лёс колеру хакі. А тыя маладыя людзі, якія на працягу першых пяці гадоў мараць пра тое, як бы хутчэй звольніцца, проста аказаліся лішнімі і чужымі ў гэтай арганізацыі энтузіястаў.

**— Што можа вас вывесці з сябе?**

— Нявызначанасць: калі ты не ведаеш, што будзеш рабіць заўтра. У прынцыпе, гэта самае страшнае ў арміі. А яшчэ існуе такое паняцце, як уводныя. Іх не любяць ні лейтэнанты, ні палкоўнікі, таму што яны заўсёды ідуць насуперак планам і змешваюць усе карты.

**— Ці ёсць прынцыпы, ад якіх не адступіцеся ні пры якіх абставінах?**

— Прынцып гонару. Жыццё пастаянна падкідвае складаныя задачкі, якія трэба вырашаць і выходзіць з гонарам з абставін, якія склаліся.

**— Што можа сапсаваць настрой?**

— Расчараванне ў людзях. Я па жыцці імкнуся не рабіць дачасных высноў аб людзях, пакуль не ўбачу перад сабой неабвержных фактаў. Таму расчараванне можа наступіць толькі тады, калі я ўбачу такія факты, якім не змагу знайсці апраўдання.

**— Ваш жыццёвы дэвіз?**

— Дагнаць і перагнаць тых, хто наперадзе, — і не чакаць тых, хто ў цябе за спінай.

**— Што лягчэй — падпарадкоўвацца або камандаваць?**

— Карнегі сцвярджаў: «Калі вы імкняцеся стаць добрым суразмоўцам, станьце, перш-наперш добрым слухачом». У гэтым выпадку можна сказаць наступнае: «Калі вы хочаце навучыцца камандаваць, навучыцеся падпарадкоўвацца».

**— Што вы абяцалі і не зрабілі?**

— Яшчэ ў школьныя гады абяцаў маме прачытаць «Вайну і мір» Талстога, але дагэтуль гэтага не зрабіў.

**— Чаго нельга дараваць нават лепшым сябрам?**

— Хлусні і здрады.

**— Які вы камандзір?**

— Галоўны герой рамана братоў Вайнераў «Эра міласэрнасці» Уладзімір Шарапаў гаворыць: «З усіх камандзіраў, якіх мне давялося ўбачыць на фронце, сапраўднымі былі толькі тыя, хто адчуваў сваю ўладу як цяжар адказнасці, а не як права распараджацца...». Я імкнуся быць сапраўдным камандзірам.

**Алена ЗАЦІРКА,**
**Ваеннае інфармацыйнае агенцтва «ВАЯР».**

# «ТАКАЯ Ў ДЭСАНТНІКАЎ РАБОТА!»

**(Заканчэнне. Пачатак на 3-й стар.)**

Традыцыі вайсковай доблесці і прафесійнага майстэрства знаходзяць пацвярджэнне ў штодзённых армейскіх буднях. Зноў жа ў музеі давялося прачытаць сціплыя радкі пра гвардыі маёра Сяргея Сухавіла, які ўзнагароджаны ордэнам «За асабістую мужнасць» у 2006 годзе. Аказалася, на занятках па агнявой падрыхтоўцы гвардыі маёр выратаваў жыццё салдату. Пры выкананні практыкавання па кіданні баявых гранат ваеннаслужачы ўпусціў гранату, з якой была вырвана чака, на дно акопа. Да ўзрыву заставаліся лічаныя секунды. Афіцэр адрэагаваў імгненна: схапіў байца за бронекамізэльку, выцягнуў з акопа і накрыў сваім целам. Абое засталіся жывыя.

Кожнае з вучэнняў, са шматлікіх спаборніцтваў, у якіх удзельнічаюць прадстаўнікі брыгады і паказваюць належныя вынікі, сведчаць пра высокі ўзровень вывучкі. У музеі нямала розных кубкаў — адзнак за перамогу. Ёсць тут і партрэты байцоў, што тыя кубкі зарабілі. Ну вось, напрыклад, Любоў Галоціна выйграла ў Расіі спаборніцтвы ваеннаслужачых пад назвай «Міравы хлопец». Праўда, сустрэцца з Любай не давялося, яна зараз у водпуску па доглядзе дзіцяці.


Гвардыі капітан Занін і гвардыі старшы лейтэнант Максіменка ў капліцы.

Згадзіцеся, яшчэ некалькі дзясяткаў гадоў таму сказаць, што баец паветрана-дэсантнага падраздзялення знаходзіцца ў дэкрэтным водпуску, было проста немагчыма, нерэальна. А цяпер — прыкмета часу — тут служаць дзяўчаты. І, паводле слоў іх камандзіраў, паспяхова служаць. Тая ж Люба Галоціна, вобразна кажучы, каго хочаш за пояс запхне, бо мае карычневы пояс па каратэ.

Вельмі ганарацца ў брыгадзе прызавым месцам у сёлетніх спаборніцтвах пад назвай «Рэпіт Трэйдэн», дзе бралі ўдзел дэсантнікі 13 краін свету. На Яварскім палігоне Украіны сустрэліся вайскоўцы з Амерыкі, Канады, еўрапейскіх краін. Пры гэтым у астатніх 12 камандах выступалі афіцэры і кантрактнікі, і толькі ў нашай — салдаты. Пасля скачкоў, якія прадэманстравалі беларусы (і паказалі лепшы вынік), калегі спачатку не верылі, што гэта зрабілі салдаты тэрміновай службы. Праўда, нашым далі другое месца, балы знялі за дрэннае веданне салдатамі англійскай мовы (з такім жа поспехам можна было папікнуць канадцаў за няведанне беларускай. — **С. Я.**) Але і другое месца — вельмі добрае дасягненне.

Удала выступілі прадстаўнікі 38-й і на спаборніцтвах «Воін Садружнасці» — так цяпер называецца былы «Міравы хлопец». Годна вытрымалі планавыя інспектарскія праверкі Мінабароны і так званыя пад'ёмы па баявой гатоўнасці. А гэта галоўны паказчык паспяховага мінулага вучэбнага года.

А перад вучэннямі, іншымі асабліва адказнымі мерапрыемствамі іх удзельнікі праходзяць чын асвячэння і атрымліваюць святарскае благаслаўленне. У 2007 годзе на тэрыторыі часці была ўзведзена капліца ў гонар святога прападобнага князя Дзмітрыя Данскога. Вельмі ўрачыстым атрымалася яе адкрыццё і асвячэнне, сабраліся найшаноўныя ветэраны брыгады. Асвяціў маленькі армейскі храм Мітрапаліт Мінскі і Слуцкі Філарэт. Зараз кожную нядзелю сюды прыходзіць святар, праводзіць гутаркі з салдатамі, па святах здзяйсняюцца службы. Адказвае за захаванасць капліцы, парадак у ёй элітнае падраздзяленне брыгады — разведвальна-дэсантная рота. Яе камандзір — гвардыі капітан Аляксандр Занін — з намеснікам гвардыі старшым лейтэнантам Аляксандрам Максіменкам, як і іх байцы, тут самыя частыя наведнікі. Духоўная падтрымка не пашкодзіць дэсантніку, лічыць гвардыі падпалкоўнік Юргель. Каплічка стала часткай агульнай выхаваўчай работы асабовага складу, якая праводзіцца на працягу вучэбнага года разам з баявой падрыхтоўкай. Сваю ролю ў гэтай справе адыгрывае, вядома, і музей.

Дарэчы, нядаўна ў ім з'явілася цэлая процьма новых экспанатаў: штыкі-нажы, каскі, пісталеты і іншая зброя, салдацкі посуд, элементы абмундзіравання часоў ВАВ. Справа ў тым, што вайскоўцы дапамагалі рыхтаваць пляцоўку для здымак фільма «Брэсцкая крэпасць».

«Нават не чакалі, што столькі ўсяго змяшчае ў сабе зямля крэпасці, — расказвае Уладзімір Юргель. — Толькі капані ў любым месцы, і, здаецца, гэты метал сам на паверхню лезе. Там яшчэ на сто гадоў капаць хопіць...» Усё, што сабралі, падпісалі, адпаведным чынам афармілі, і атрымалася экспазіцыя ў першай зале музея. Астатнія залы прысвечаны ў асноўным вехам гісторыі роднай часці. Экскурсію тут з задавальненнем правядзе любы з работнікаў штаба. Як, напрыклад, начальнік несакрэтнага справаводства гвардыі малодшы сяржант Алена Шчагельская. Алена адразу падыходзіць да стэнда, на якім зафіксаваны моманты спаборніцтваў на права прысваення знака «Чорны арол». Такія экстрэмальныя выпрабаванні на мяжы чалавечых магчымасцяў вытрымлівалі не ўсе, і знак даставаўся самым моцным і доблесным — суперпрафесіяналам. Муж Алены, гвардыі падпалкоўнік Юрый Шчагельскі, мае адзнаку «Чорны арол». «Сэрца кроўю не аблівалася, — пытаю, — калі ён праходзіў выпрабаванні?» — «Яшчэ як аблівалася, — кажа Алена, — але такая работа ў дэсантнікаў».

«Чорны арол» зарадзіўся тут, у 38-й дэсантнай брыгадзе. Пазней досвед быў вывучаны, абагульнены, і «Чорны арол» паступова трансфармаваны ў рух «Доблесць і майстэрства», які падхапілі многія вайсковыя фарміраванні Узброеных Сіл краіны.

**Святлана ЯСКЕВІЧ. Фота аўтара**

# ...РАЗВІЦЦЁ З ХУТКАСЦЮ ПРАГРЭСУ!

**(Заканчэнне. Пачатак на 3-й стар.)**

Акрамя заняткаў на базавым факультэце, яны спасцігаюць азы ваеннай справы на факультэце па праграмах падрыхтоўкі спецыялістаў агульнавайсковай кафедры, — паведаміў **начальнік ваеннага факультэта палкоўнік Ігар Анатольевіч НОВІКАЎ**. — Ваенны журналіст павінен добра валодаць усімі асаблівасцямі службы ў арміі на ўсіх узроўнях — ад салдата да генерала, а пазнаёміцца з умовамі службы можна толькі непасрэдна ў войсках. Таму курсанты штолета выязджаюць на вучэбныя практыкі і стажыроўкі ў вайсковыя часці розных гарнізонаў. Пасля першага і другога курсаў яны практыкуюцца на пасадах малодшых камандзіраў, а на старэйшых курсах — на пасадах намеснікаў камандзіраў падраздзяленняў па ідэалагічнай рабоце.

**Да нас на факультэт дасылаюць самыя лепшыя водгукі аб узроўні падрыхтоўкі нашых курсантаў і выпускнікоў-лейтэнантаў. Дарэчы, атрымаць адказы на ўсе пытанні наконт паступлення, навучання і далейшых перспектыў выпускнікоў непасрэдна ад кіраўніцтва, саміх курсантаў, а таксама асабіста паглядзець на тое, у якіх умовах праходзіць навучанне, можна ў Дзень адчыненых дзвярэй, што адбудзецца 5 студзеня 2012 года на ваенным факультэце. Мы запрашаем да нас усіх ахвотных.**


На практыцы ў ваенным інфармацыйным агенцтве «ВАЯР»: кіраўнік практыкі Аляксандр Макараў і курсант Сяргей Дзямінскі.

Раней, у часы Савецкага Саюза, падрыхтоўкай ваенных журналістаў першага звяна займаліся толькі ў Львоўскім вышэйшым ваенным палітычным вучылішчы. Потым, пасля распаду СССР, гэтая сістэма таксама распалася: кожная краіна па-свойму рэалізуе задачу падрыхтоўкі кадраў для ваенных СМІ. Некаторыя з выпускнікоў той легендарнай «савецкай школы ваеннай журналістыкі» працуюць зараз і ў ваенным інфармацыйным агенцтве «Ваяр», што было заснавана ў 2008 годзе па ініцыятыве яго цяперашняга кіраўніка палкоўніка Андрэя Юр'евіча Шубадзёрава. Гэта сучасны ваенны медыяхолдынг, які сумяшчае ў сваёй структуры творчыя калектывы «Белорусской военной газеты. Во славу Родины», часопіса «Армия», сайта Мінабароны і адначасова выконвае функцыю прэс-цэнтра Міністэрства абароны. Менавіта тут складаюцца радок да радка і творы будучых ваенных журналістаў: штогадова курсанты ваеннага факультэта БДУ праходзяць у «Ваяры» практыку пад куратарствам масцітых акул пяра — афіцэраў агенцтва. Адным з вопытных прафесійных дарадцаў і настаўнікаў для будучых ваенных журналістаў падчас практыкі з'яўляецца начальнік аддзела баявой падрыхтоўкі і будаўніцтва Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь падпалкоўнік Ігар Кандраль:

— Пачынаючым ваенным журналістам я б даў наступную параду: не баяцца «пагонаў з вялікімі зоркамі» падчас інтэрв'ю і збору інфармацыі, бо на ваеннай службе больш чым дзе адчуваецца ўздзеянне падначаленасці і розніцы ў пасадзе і званні, што можа адбіцца на якасці журналісцкага тэксту — не дай Бог ён атрымаецца афіцыёзным, гэта можа замінаць у вырашэнні праблемных пытанняў, — адзначае Ігар Уладзіміравіч. — Зычу ім вучыцца дзейнічаць у экстрэмальных сітуацыях, якіх нямала будзе на службе, бо нават у мірны час асноўная праца ваеннага журналіста праходзіць у камандзіроўках на шматлікіх вучэннях на палігонах.

Але вопыт першай практыкі для курсантаў-журналістаў — далёка не першы ў іх амплуа ў якасці рэпарцёра ці карэспандэнта. Першыя спробы пяра праходзяць задоўга да паступлення: кожны абітурыент абавязаны ўжо на ўступным іспыце мець партфоліа з апублікаванымі ў сродках масавай інфармацыі матэрыяламі. Іх павінна быць у творчай скарбонцы абітурыента каля дзесяці (пажадана, зразумела, больш). Як правіла, тыя, хто выбірае такую творчую спецыяльнасць, робяць гэта асабліва асэнсавана, бо паступленне звязана з доўгай мэтанакіраванай падрыхтоўкай і ўзаемадзеяннем з рэдакцыямі розных выданняў. Напрыклад, яшчэ суворaўцам я супрацоўнічаў з «Белорусской военной газетой. Во славу Родины «, газетай «Переходный возраст» і сваёй раённай газетай «Асіповіцкі край». Маё асабістае «партфоліа» пры паступленні складалася з васьмі публікацый — на творчым тэсціраванні я атрымаў восем балаў па дзесяцібальнай шкале.

...Дзень курсантаў-журналістаў пачынаецца з агульнага пад'ёму ў шэсць гадзін раніцы і ранішняй зарадкі — вядома, для іх дзейнічаюць тыя ж правілы, што і для іншых курсантаў батальёна ваеннага факультэта (гэта структурнае падраздзяленне ваеннага факультэта, бо акрамя журналістаў, на ваенным факультэце навучаецца яшчэ шэраг спецыяльнасцяў, якія разам і складаюць цэлы батальён). Трымаць сябе ў добрай фізічнай форме дапамагаюць і рэгулярныя рознабаковыя заняткі па фізічнай падрыхтоўцы. У распараджэнні курсантаў сучасны спартыўны комплекс БДУ «Універсітэцкі» з басейнам, трэнажорнымі і барцоўскім заламі, стадыёнам — надзвычай спрыяльныя ўмовы для заняткаў спортам. Але трэба мець на ўвазе, што праграма фізічнай падрыхтоўкі для курсантаў таксама арыентавана на фарміраванне сапраўднага фізічна падрыхтаванага вайскоўца. Яны, у адрозненне ад сваіх грамадзянскіх калег-журналістаў, ходзяць заўсёды ў форме, заступаюць у сутачныя нарады і жывуць па строга размеркаваным распарадку дня.

Што датычыцца курсанцкага побыту, то толькі курсанты першага і другога курса пражываюць у казарме, старэйшыя ж курсы — у студэнцкім інтэрнаце ці дома (мінчукі). Смачна паесці курсанту можна ў студэнцкай сталоўцы на талоны на харчаванне, якія ім выдаюць кожны дзень (цяпер гэта складае каля 23 тысяч рублёў на чалавека ў дзень). Грашовае забеспячэнне курсанта (нешта накшталт стыпендыі ў студэнтаў) складае больш за 700 тысяч і можа павышацца ў залежнасці ад яго пасады і воінскага звання. Для выдатнікаў вучобы таксама прадугледжаны матэрыяльныя «бонусы».

А вось у магчымасці творча праявіць сябе курсантам пазайздросцілі б многія пакаленні ваенных журналістаў. Сапраўды, падчас вучобы хлопцы публікуюць свае матэрыялы не толькі ў ваеннай прэсе, але і ў любой грамадзянскай, — за што, само сабой, атрымліваюць сякія-такія ганарар — грошы хоць і не вельмі вялікія, але хопіць схадзіць у вольны час з дзяўчынай у кіно ці нават рэстаран.

З мінулага года на ваенным факультэце штомесячна ў імправізаванай курсанцкай рэдакцыі выпускаецца газета «Вестник военного факультета», якая ўжо была адзначана дыпломам другой ступені на конкурсе малатыражных студэнцкіх газет Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта.

Пакуль ваенная журналістыка — даволі малады кірунак у айчыннай журналістыцы, але развіваецца з хуткасцю прагрэсу інфармацыйных тэхналогій. Спектр тэм, якія трапляюць пад увагу ваенных журналістаў, вельмі шырокі, а галоўная — дзейнасць Узброеных Сіл і абарона нашай краіны. І паступова на гэтую сцежку ўпэўнена і цвёрда становяцца выпускнікі ваеннага факультэта БДУ — маладыя журналісты ў пагонах.

# НА ВАЕННЫХ ІНЖЫНЕРАЎ ВУЧАЦЬ У ГОМЕЛІ

**ТОЛЬКІ ў дзвюх ВНУ, якія знаходзяцца не ў сталіцы, а ў абласных цэнтрах, ёсць ваенныя факультэты, дзе рыхтуюць кадры для Узброеных Сіл краіны. Адзін з іх — у гомельскім Беларускім дзяржаўным універсітэце транспарту. Менавіта сюды паступаюць хлопцы, каб набыць вельмі запатрабаваныя спецыяльнасці па аднаўленні і будаўніцтве чыгуначных пуцей, штучных збудаванняў, транспартных камунікацый, а таксама па тэхнічнай эксплуатацыі машын і абсталявання. Пасля пяці гадоў навучання атрымліваюць дыплом, у якім будзе запіс: «Спецыяліст па кіраванні. Інжынер». Адначасова з заканчэннем загадам Міністра абароны выпускнікам прысвойваецца вайсковае званне «лейтэнант». Пра асаблівасці паступлення і навучання мы гутарым з першым намеснікам начальніка ваеннага факультэта па навучальнай і навуковай працы БелДУТа, падпалкоўнікам Аляксеем ПАДДУБНЫМ.**



— Пастаянны конкурс пры паступленні на наш факультэт вагаецца ад 2 да 3 чалавек на месца. Справа ў тым, што дакументы мы прымаем трохі раней, чым іншыя ВНУ, і таму абітурыент, які бачыць, што да нас не праходзіць, звычайна перакідвае іх на іншыя спецыяльнасці.

**— Відаць, усё пачынаецца з патрабаванняў да здароўя абітурыента?**

— Так, здароўе павінна быць выдатнае. Пры паступленні абітурыенты праходзяць прафесійны адбор у ваенкамаце, і спецыяльная камісія вырашае, наколькі прыдатны малады чалавек для вучобы на нашым факультэце. Магу адзначыць як агульную праблему ўсяго насельніцтва: сярод тых, хто хоча паступіць да нас, вялікі адсеў апошнім часам ідзе менавіта па стане здароўя. Тыя курсанты, якія ўрэшце трапляюць да нас на факультэт, лічыце, адразу служаць ва Узброеных Сілах не як салдаты тэрміновай службы, а як афіцэры. Яны на першым курсе прымаюць прысягу на вернасць радзіме.

**— Форма навучання на вашым факультэце — толькі дзённая і выключна на бюджэтнай аснове?**

— Так, і на поўным дзяржаўным забеспячэнні, якое ўключае харчаванне, пражыванне, абмундзіраванне і грашовае забеспячэнне. Маладыя людзі падпісваюць кантракт. Згодна з ім зараз мінімальнае грашовае забяспячэнне складае Br730 тысяч рублёў. А калі курсант вучыцца добра і выдатна, яго стыпендыя павышаецца на 10-20%. Тыя, хто займаюць пасаду камандзіра аддзялення, таксама атрымліваюць больш. Першыя два гады навучання хлопцы жывуць у казарме, а апошнія 3 гады — у інтэрнаце БелДУТа, які знаходзіцца ў цэнтры горада. У іх звычайныя пакоі, разлічаныя на 3-4 чалавекі. Курсанты не адарваны і не ізаляваны ад агульнага ўніверсітэцкага жыцця. У суботу і нядзелю яны наведваюць дом або ўдзельнічаюць у самых разнастайных мерапрыемствах. Малады чалавек, які вучыцца на нашым факультэце, адаптаваны да сучанага грамадзянскага жыцця лепш, чым, напрыклад, курсанты ваенных вучылішчаў.

**— Аляксей Аляксеевіч, у чым асаблівасці непасрэдна навучання на ваенным факультэце БелДУТа?**

— У нас шматузроўневая падрыхтоўка, адзіная для ўсёй дзяржавы. Спачатку курсанты вывучаюць фундаментальныя навукі: фізіку, матэматыку, хімію, супрамат, механіку матэрыялаў і гэтак далей. Падбор прафесарска-выкладчыцкага склада ва ўніверсітэце выдатны, што дазваляе адначасова праводзіць асваенне ваенных і спецыяльных дысцыплін. Нашы курсанты, зразумела, займаюцца агульнафізічнай падрыхтоўкай, вучацца страляць. У нас ёсць свой цір. Хлопцы спачатку набываюць навыкі стральбы з пнеўматычнай і дробнакаліберной зброі, а потым — са штатнай: аўтамата Калашнікава і пісталета Макарава. Для адпрацоўкі ваенна-прыкладных дысцыплін ёсць пляц побач з самой установай і яшчэ на тэрыторыі ваеннай часці 5525. Ёсць спецыяльна абсталяваная зала для заняткаў рознымі відамі спорту і басейн — адзін з лепшых у Гомелі. У нас працуе больш як 10 спартыўных секцый. Мы ўдзельнічаем ва ўсіх спартакіядах Узброеных Сіл, БелДУТа, таварыства «Дынама», ва ўсіх гарадскіх спаборніцтвах... Пасля засваення фундаментальных і агульнавайскавых навук мы пераходзім да спецыяльных, якія даюць права атрымаць кваліфікацыю інжынера. Тут працуюць нашы кафедры ваенна-спецыяльнай і агульнавайсковай падрыхтоўкі. Дарэчы, афіцэраў-маставікоў нідзе больш у краіне не рыхтуюць, толькі ў нас на факультэце. Спецыяльнасць гэта дэфіцытная і запатрабаваная не толькі ва Узброеных Сілах.

**— Сёння не абысціся без высокіх тэхналогій...**

— У нас усе курсанты забяспечаны камп'ютарамі. Не забаронена мець свае нэтбукі, ноўтбукі, планшэты, тэлефоны з выхадам у інтэрнэт. На нашым факультэце ёсць 3 спецыялізаваныя аўдыторыі, укамплектаваныя камп'ютарамі. У іх знаходзяцца вучэбна-метадычныя комплексы, дзе ёсць неабходныя для навучання праграмы. Між іншым, кіраўніцтва ўніверсітэта заўсёды дапамагае з закупкай сучаснага абсталявання. Зусім нядаўна па загадзе рэктара Веніяміна Сянько набыты камп'ютары з прынтарамі, якія будуць размешчаны ў казарме і інтэрнаце. Гэта зроблена для таго, каб курсанты маглі раздрукоўваць свае курсавыя і дыпломныя праекты менавіта на гэтай тэхніцы. Мы ідзём у нагу з часам. Адна з аўдыторый у нас абсталявана інтэрактыўнай дошкай. Праграмы для яе пішуць як выкладчыкі, так і самі курсанты. Гэта адзін з відаў навуковай працы, якая потым укараняецца ў навучальны працэс. Плануем таксама закупіць сучасныя планшэты з выхадам у інтэрнэт і паступова адыходзіць ад звычайных падручнікаў. У нас працуе 7 ваенна-навуковых гурткоў. Дарэчы, спадзяёмся, што ў хуткім часе пачнём падрыхтоўку інжынераў-вадалазаў. Калі праект будзе зацверджаны, будзем рыхтаваць афіцэраў-маставікоў па праграме вадалазаў. Дадам, што цяпер літаральна ўсе выпускнікі факультэта атрымліваюць пасведчанні кіроўцы катэгорыі «С».

**— Пры такой сур'ёзнай навучальнай нагрузцы ў маладых людзей застаецца вольны час?**

— Нашы курсанты прымаюць актыўны ўдзел ва ўсіх агульнагарадскіх мерапрыемствах патрыятычнай накіраванасці. Мы добраўпарадкоўваем месцы пахавання воінаў, якія загінулі падчас Вялікай Айчыннай вайны. Будучыя афіцэры не павінны быць чэрствымі: ажыццяўляем шэфства над дзецьмі з гомельскага абласнога цэнтра карэкцыйна-развіваючага навучання і рэабілітацыі. Зараз удзельнічаем у валанцёрскай акцыі «Добрае сэрца». Да Новага года курсанты зробяць дзецям з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця падарункі. Рэгулярна праводзяцца экскурсіі. Мы наведваем практычна ўсе славутасці не толькі ў Гомелі, але і па ўсёй краіне. Канцэрты, спартыўныя спаборніцтвы, конкурс вясёлых і знаходлівых, «Першакурснік», «Зімовая вясёлка», «За цудоўных дам!» — гэтыя і іншыя конкурсы, дзе нашы хлопцы не толькі актыўна ўдзельнічаюць, але і займаюць прызавыя месцы.

**— Якім чынам курсанты факультэта падыходзяць да размеркавання?**

— У нас адсочваецца рэйтынг кожнага курсанта: з першага да пятага курса. Ацэньваецца не толькі вучоба, але і дысцыпліна, удзел у грамадскіх мерапрыемствах, спартыўных спаборніцтвах... Чым вышэйшы рэйтынг, тым больш магчымасцяў для выбару далейшага месца службы. Зразумела, улічваецца і тое, адкуль выпускнік родам, жанаты ён ці не. Дарэчы, падчас вучобы жанатым курсантам мы дазваляем пражыванне сумесна з сям'ёй ці прадастаўляем інтэрнат для сямейных пар.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**
**Фота аўтара і з архіва ВТФ БелДУТа.**



**Колькі пенсіянераў прыходзіцца на тысячу працуючых беларусаў? Як працуе сёння нацыянальная пенсійная сістэма? Ці трэба падымаць планку пенсійнага ўзросту? Як забяспечыць годную старасць кожнаму? Якія пытанні, звязаныя з пенсійнай сістэмай, больш за ўсё цікавяць людзей? Пра ўсё гэта — у нашым спецвыпуску «Усё пра пенсіі».**

# «Забяспечыць і ў далейшым бесперабойную працу і прымальны ўзровень выплат пенсій»

**Пра тое, як працуе сёння нацыянальная пенсійная сістэма і ці плануюцца ў бліжэйшы час у ёй якія-небудзь змены, «Звяздзе» расказала намеснік міністра працы і сацыяльнай абароны Валянціна КАРАЛЁВА.**


Фота БЕЛТА.

***— Як сёння выглядае памер беларускай пенсіі на фоне краін СНД?***

— У доларавым эквіваленце — на чацвёртым месцы. У канцы мінулага года была на другім.

***— Вы неяк сказалі, што ў Беларусі — вельмі шчодрая пенсійная сістэма. Вы сапраўды так лічыце? Асабліва з улікам новых умоў?***

— Шчодрасць пенсійнай сістэмы заключаецца ў тым, што яна прадастаўляе выплаты вельмі рана. У нашым заканадаўстве вельмі шмат падстаў для выхаду на пенсію раней за 55/60 гадоў. Сёння ў ліку атрымальнікаў пенсій — 27 працэнтаў насельніцтва краіны. Варта таксама заўважыць, што ў нас права на пенсію маюць усе без выключэння пастаянна пражываючыя грамадзяне Рэспублікі Беларусь, грамадзяне іншых дзяржаў і асобы без грамадзянства. Гэта значыць, у нас няма ніводнага непрацаздольнага чалавека, які не атрымліваў бы тую ці іншую пенсію.

Памеры пенсій у кожнай дзяржаве вызначаюцца, зыходзячы з магчымасцяў гэтай дзяржавы, перш за ўсё яе эканомікі. Маючы невысокую заработную плату, немагчыма мець высокую пенсію. Але пры гэтым у сацыяльнай дзяржаве ў абавязковым парадку было, ёсць і павінна быць у мэтах сацыяльнай справядлівасці пэўнае пераразмеркаванне даходаў для непрацаздольных. Калі чалавек ужо не працуе, не так важна, кім ён працаваў у маладосці. Патрэбнасці ў непрацаздольнага 80-гадовага чалавека, па сутнасці, аднолькавыя — незалежна ад таго, быў ён рабочым, інжынерам ці яшчэ кімсьці.

***— Што датычыцца павышэння пенсійнага парогу для выхаду на пенсію: якія перспектывы на гэты конт? Ці разглядаюцца якія-небудзь варыянты дзеянняў праз 10-15 гадоў?***

— Павышэнне пенсійнага ўзросту — адна з дзейсных мер стабілізацыі пенсійных выдаткаў дзяржавы, гэта агульнавядома. Што тычыцца перспектыў яго прымянення ў Беларусі — арыенціры тут ужо неаднаразова агучваліся кіраўніком дзяржавы. Пакуль гэта магчыма, мы будзем захоўваць дзейны «пенсійны» парог.

У цэлым, пытанне павышэння пенсійнага ўзросту — не самае галоўнае ў пенсійнай сістэме. Павысіўшы пенсійны ўзрост, можна на час вырашыць праблему, але потым людзі падыдуць да таго, больш высокага ўзросту, і ўсё роўна сітуацыя будзе такой жа. Гэта толькі пытанне пэўнага прамежку часу. Нельга не ўлічваць і працягласць жыцця ў краіне. Я не супраць павышэння пенсійнага ўзросту. Але праблему трэба разглядаць у комплексе. У нас ёсць яшчэ нерацыянальныя моманты ў пенсійнай сістэме, як і ў любой іншай. Напрыклад, у нас, як я толькі што сказала, вельмі шмат падстаў для датэрміновага выхаду на пенсію. А ці так ужо яны патрэбныя, гэтыя раннія пенсіі? Яны не могуць быць высокімі. Але калі гэта выбар грамадства, калі людзі хочуць рана сыходзіць на пенсію, тады трэба адэкватна ўспрымаць яе памеры.

***— Ці плануецца ў Беларусі зраўнаваць узрост выхаду на пенсію для мужчын і жанчын? Якое ваша асабістае меркаванне на гэты конт?***

— Павышэнне пенсійнага ўзросту, перш за ўсё для жанчын, уяўляецца істотным рэзервам на перспектыву. У перспектыве гэта пытанне будзе разглядацца, зыходзячы з эканамічных магчымасцяў і дэмаграфічных змяненняў. Асабіста я лічу, што трэба зраўнаваць узрост. Бо гэта свайго роду дыскрымінацыя: у жанчын атрымліваецца меншы стаж і, адпаведна, меншы памер пенсіі.

***— Міністэрства працы і сацыяльнай абароны ў апошні час прапагандуе адтэрмінаваную пенсію...***

— Калі працягваць працаваць, адмовіўшыся ад атрымання пенсіі, то яе памер пасля будзе павышаны, прычым такая праца ацэньваецца «даражэй», чым у дапенсійным узросце. Такім чынам, адтэрміноўка звароту па атрыманне пенсіі дазваляе забяспечыць больш важкія пенсійныя выплаты ў той час, калі пенсія стане адзінай крыніцай сродкаў існавання. У нашых планах — зрабіць адкладзены зварот, каб атрымаць пенсію, яшчэ больш прывабным. Мы цяпер працуем над гэтым, плануем увесці большую прэмію.

***— У Расіі назапашвальна-размеркавальная мадэль пенсійнай сістэмы. У нас жа яна размеркавальная. Ці плануюцца тут нейкія змены?***

— Змены ў пенсійнай сферы, тым больш кардынальныя, могуць праводзіцца толькі з тым, каб зрабіць пенсійнае забеспячэнне непрацаздольнай часткі грамадства яшчэ больш важкім, стабільным, эфектыўным. А цяпер давайце звернем увагу на досвед Расіі. Там на самым высокім узроўні неаднаразова агучвалася, што ўвядзенне ў пенсійную сістэму назапашвальнай часткі не апраўдала чаканняў. У прыватнасці, бягучыя пенсіі (цяперашнім пенсіянерам) рэзка знізіліся адносна даходаў работнікаў. Назапашаныя ж на будучыню пенсійныя сумы ў выніку інфляцыі, асабліва ў крызісных умовах, аказаліся вельмі нізкімі, ніжэй за ўласна затрачаныя на іх сродкі. Там ужо абмяркоўваецца магчымасць адмовы ад назапашвання ў абавязковай сістэме і вывад яго ў рамкі грамадзянска-прававога страхавання. Па вялікім рахунку, у Расіі сёння кажуць пра тое, што за аснову неабходна браць стаж і заробак. Гэта якраз тыя параметры, якіх прытрымліваемся мы ў сваёй пенсійнай сістэме. Наэксперыментаваўшыся, там прыходзяць да разумення таго, што гэтыя два паказчыкі з'яўляюцца асноўнымі, якія вызначаюць памер пенсіі.

Таму стрыманасць і ўзважанасць пры прыняцці любых рашэнняў у сацыяльнай і пенсійнай сферы, якія заўсёды адрознівалі нашу краіну, уяўляюцца абсалютна абгрунтаванымі. Мы не плануем рабіць пенсійнае назапашванне абавязковым, занадта шырока распаўсюджаны негатыўныя прыклады па ўсім свеце, не толькі ў Расіі. Дарэчы, менавіта на салідарнасці, на размеркавальных прынцыпах заснаваны дзяржаўныя пенсійныя сістэмы ва ўсіх развітых еўрапейскіх краінах, ды і ў тых жа ЗША. Па шляху ўвядзення абавязковага назапашвання ў пенсійных сістэмах пайшлі толькі навічкі Еўрасаюза, а іх эканамічнае, ды і сацыяльнае становішча занадта далёкія ад таго, каб быць прыкладам для пераймання.

У нас сёння існуе магчымасць добраахвотна назапасіць на сваю старасць. Кожны можа зрабіць гэта індывідуальна, дастаткова скарыстацца адной са страхавых пенсійных праграм, прапанаваных страхавымі арганізацыямі нашай краіны. А галоўная задача дзяржаўнай пенсійнай сістэмы — не дапусціць беднасці сярод непрацаздольных грамадзян.

***— Ці плануецца ў Беларусі паменшыць для наймальнікаў памер адлічэнняў на пенсійнае страхаванне? Ці праўда, што ў нашай краіне гэты паказчык самы высокі — 28% ад Фонду заработнай платы?***

— Адзін з высокіх, але не самы высокі. У некаторых краінах з блізкімі дэмаграфічнымі параметрамі ён такі ж ці яшчэ вышэй (ва Украіне — 33,2%) Памер страхавых узносаў ва ўсіх пенсійных сістэмах ўстанаўліваецца ў залежнасці ад наяўных абавязацельстваў. У нашай краіне ў ліку атрымальнікаў пенсій — 27 працэнтаў насельніцтва (2,5 млн чал.). Дэмаграфічныя тэндэнцыі такія, што гэтая доля будзе расці. Акрамя таго, у нас абавязковыя ўзносы працадаўцаў і работнікаў на дзяржаўнае пенсійнае страхаванне з'яўляюцца адзінай крыніцай фінансавання пенсій. Калі мы панізім узровень узносаў, паменшацца дзяржаўныя сацыяльныя гарантыі. Па гэтым шляху сацыяльная дзяржава пайсці не можа.

***— Ці захаваецца цяперашняя формула адлічэнняў на пенсійнае страхаванне, калі 28% пералічвае наймальнік, 1% — працаўнік? Якая пазіцыя Мінпрацы і сацабароны па гэтым пытанні?***

— Калі казаць аб размеркаванні пенсійнай нагрузкі паміж працадаўцамі і работнікамі, то Міністэрства лічыць нематазгодным яго змяняць па прычыне вельмі негатыўных наступстваў, як для бюджэту Фонду сацыяльнай абароны насельніцтва, так і для мясцовых бюджэтаў.

Бізнэс прапануе перакласці істотную частку цяжару па выплаце ўзносаў на работнікаў. Пры гэтым намераў адэкватна павысіць работніку заработную плату, з якой выплачваліся б павышаныя ўзносы, не бачыцца. Бо бізнэс зацікаўлены ў чыстым зніжэнні сукупных выдаткаў на працоўную сілу. А пры лібералізацыі эканомікі дзяржава губляе магчымасць уплыву на ўзровень аплаты працы. Таму, з улікам негатыўных наступстваў такіх крокаў для работнікаў, змяненняў не плануецца.

***— І ўсё ж ці рыхтуюцца нейкія навацыі ў пенсійным заканадаўстве? Чаго чакаць у бліжэйшыя гады?***

— Рэвалюцыйных пераўтварэнняў не плануецца. Асноўная задача — забяспечыць і ў далейшым бесперабойную працу і прымальны ўзровень выплат. Таксама неабходна арыентаваць работнікаў на актыўны ўдзел у дадатковых добраахвотных праграмах пенсійнага страхавання з мэтай дапаўнення дзяржаўных пенсійных гарантый.

У нас ёсць грошы для таго, каб своечасова выплачваць пенсіі і каб праводзіць пераразлікі пенсій, як гэта было сёлета.

**Сёння працягвае працаваць каля 540 тысяч пенсіянераў (65% з іх — жанчыны). Доля працуючых пенсіянераў у агульнай колькасці занятых у эканоміцы складае 12% (не лічачы пенсіянераў па лініі сілавых ведамстваў і міністэрстваў).**

**Зараз у органах па працы, занятасці і сацыяльнай абароне розныя віды пенсій атрымліваюць больш як 2,4 млн чалавек. Перапіс 2009 года паказаў, што на тысячу працаздольных у Беларусі ў той момант прыпадалі 624 пенсіянеры. Па прагнозах, да 2030 года на 1000 чалавек працаздольнага ўзросту будзе прыпадаць 841 пенсіянер.**

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.


## ПРАЦА ЗА МЯЖОЙ І ПЕНСІЯ

**НА пытанні нашых чытачоў адказвае начальнік аддзела пенсійнага заканадаўства галоўнага ўпраўлення пенсійнага забеспячэння і сацыяльнага страхавання Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Рэспублікі Беларусь Алена ГОМАРАВА.**

### Ці ўключаецца праца за межамі Рэспублікі Беларусь у стаж пры прызначэнні пенсіі ў Беларусі і пры якіх умовах?

— Згодна з артыкулам 51 Закона Рэспублікі Беларусь «Аб пенсійным забеспячэнні», у стаж працы залічваюцца перыяды работы, у тым ліку той, што працякала за мяжой, пры ўмове, што на працягу гэтых перыядаў ажыццяўлялася выплата абавязковых страхавых узносаў у адпаведнасці з заканадаўствам аб дзяржаўным сацыяльным страхаванні.

Пры накіраванні работнікаў у камандзіроўку за мяжу пералік узносаў у Фонд сацыяльнай абароны насельніцтва Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Рэспублікі Беларусь ажыццяўляецца іх працадаўцамі.

Што датычыцца грамадзян, якія працуюць за межамі нашай рэспублікі і не знаходзяцца ў працоўных адносінах з працадаўцам на тэрыторыі нашай краіны, то, згодна з Законам Рэспублікі Беларусь «Аб асновах дзяржаўнага сацыяльнага страхавання», яны могуць добраахвотна ўдзельнічаць у дзяржаўным сацыяльным страхаванні шляхам самастойнай выплаты ўзносаў на пенсійнае страхаванне ў Фонд сацыяльнай абароны насельніцтва. Пры гэтым неабходна ўлічваць, што ў выпадку выплаты ўзносаў з даходу, ніжэйшага за мінімальную заработную плату (з улікам індэксацыі), стаж для прызначэння пенсіі будзе вылічацца з улікам папраўчнага каэфіцыента.

### Якім чынам грамадзяне нашай краіны, якія працуюць за мяжой, могуць выплачваць абавязковыя страхавыя ўзносы на беларускую пенсію?

— Для гэтага неабходна стаць на ўлік у якасці плацельшчыка сацстраху ў аддзеле Фонду сацыяльнай абароны насельніцтва па месцы жыхарства ў нашай краіне. Для пастаноўкі на ўлік пішацца заява, прад'яўляецца дакумент, які сведчыць асобу, а таксама працоўны або грамадзянска-прававы дагавор на беларускай або рускай мовах.

Варта адзначыць, што пасля пастаноўкі на ўлік такія грамадзяне будуць плаціць на пенсійнае страхаванне 29 працэнтаў ад сумы самастойна вызначанага імі даходу не пазней 25 чысла кожнага месяца. Пры гэтым права на такія выплаты, як дапамога па часовай непрацаздольнасці, па цяжарнасці і родах, дапамога ў сувязі з нараджэннем дзяцей у гэтым выпадку не ўзнікае.

**P.S.** *Згодна з пенсійным заканадаўствам, у тых выпадках, калі пагадненнямі (дагаворамі) аб сацыяльным забеспячэнні паміж Рэспублікай Беларусь і іншымі дзяржавамі прадугледжаны іншыя правілы, адпаведна прымяняюцца правілы, вызначаныя гэтымі пагадненнямі (дагаворамі).*

*У цяперашні час такія пагадненні (дагаворы) заключаны паміж дзяржавамі — удзельніцамі СНД (за выключэннем Азербайджана), а таксама з Літвой і Латвіяй. З палажэннямі гэтых пагадненняў можна азнаёміцца ва ўпраўленні па працы, занятасці і сацыяльнай абароне па месцы жыхарства.*

**Матэрыялы паласы падрыхтавала Святлана БУСЬКО.**

## ПЕНСІІ Ў ЛІЧБАХ

**У Беларусі сярэднямесячная пенсія ўсіх відаў у студзені—лістападзе бягучага года склала 683,1 тыс. руб. — на 37,6% больш, чым у студзені—лістападзе мінулага года. Сярэдняя пенсія ўсіх відаў у гэтым лістападзе дасягнула 941 тыс. руб.**

Памер сярэдняй працоўнай пенсіі ў лістападзе 2011 года склаў 949,7 тыс. руб. Сярэдняя пенсія па ўзросце ў лістападзе склала 974,3 тыс. руб., мінімальная па ўзросце (з улікам даплаты да яе) — 684,1 тыс. руб. Сярэдняя пенсія па інваліднасці складае 872 тыс . руб., з нагоды страты карміцеля — 625,5 тыс. руб., за выслугу гадоў — 1 млн 266,8 тыс. руб., за асаблівыя заслугі перад рэспублікай — 1 млн 447,1 тыс. руб.

Сярэдні памер сацыяльнай пенсіі складае ў лістападзе 631,9 тыс. руб. Сярэднямесячны памер сацыяльнай пенсіі ў студзені—лістападзе 2011 года ўзрос на 63,5% у параўнанні з аналагічным леташнім перыядам.

Што датычыцца разліковых паказчыкаў, то максімальная пенсія па ўзросце для непрацуючых пенсіянераў (пры стажы 40 гадоў у жанчын і 45 гадоў у мужчын і індывідуальным каэфіцыенце заробку 4,0 і вышэй) складае ў лістападзе 1 млн 504 тыс. руб. Максімальная пенсія па ўзросце для непрацуючых пенсіянераў з ліку былых шахцёраў пры стажы падземнай работы не менш за 10 гадоў у мужчын і 7,5 года ў жанчын — 1 млн 916 тыс. руб., пры стажы работы на асобных відах падземных і адкрытых горных работ не менш як 25 гадоў у мужчын і 20 гадоў у жанчын — 2 млн 329 тыс. руб. Максімальная пенсія па ўзросце для працуючых пенсіянераў (пры індывідуальным каэфіцыенце заробку 1,3 і вышэй і стажы 40/45 гадоў) — 1 млн 92 тыс. руб.

## ХТО МАЕ ПРАВА НА ПЕНСІЮ ЗА АСАБЛІВЫЯ ЗАСЛУГІ ПЕРАД РЭСПУБЛІКАЙ БЕЛАРУСЬ

**Пенсія за асаблівыя заслугі прызначаецца:**

✓Героям Беларусі, Героям Савецкага Саюза, Героям Сацыялістычнай Працы;

✓асобам, узнагароджаным ордэнамі Айчыны трох ступеняў, ордэнамі «За службу Радзіме» трох ступеняў, ордэнамі Славы трох ступеняў, ордэнамі Працоўнай Славы трох ступеняў, ордэнамі «За службу Радзіме ва Узброеных Сілах СССР» трох ступеняў;

✓грамадзянам, узнагароджаным трыма і больш ордэнамі Рэспублікі Беларусь і (або) СССР;

✓асобам, удастоеным ганаровых званняў Рэспублікі Беларусь, БССР ці СССР (народны, заслужаны);

✓лаўрэатам Дзяржаўных прэмій Рэспублікі Беларусь, БССР, Ленінскай і Дзяржаўнай прэмій СССР;

✓камандзірам, камісарам, начальнікам штабоў партызанскіх брыгад і атрадаў;

✓пераможцам і прызёрам Алімпійскіх, Паралімпійскіх, Дэфлімпійскіх гульняў, чэмпіёнам свету і Еўропы;

✓грамадзянам, што займалі вышэйшыя дзяржаўныя пасады Рэспублікі Беларусь, членам урада Рэспублікі Беларусь, старшыням аблвыканкамаў і Мінскага гарвыканкама — пасля спынення імі працы ў названых пасадах.

**Паводле статыстычных звестак, пенсію за асаблівыя заслугі перад Рэспублікай Беларусь атрымліваюць 4,8 тыс. беларусаў.**

**Права на пенсію за асаблівыя заслугі маюць грамадзяне, што пражываюць на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, якія атрымліваюць пенсію па ўзросце, па інваліднасці, за выслугу гадоў і якія маюць асаблівыя заслугі перад Рэспублікай Беларусь:**

✓якія атрымліваюць пенсію па ўзросце або за выслугу гадоў, — па дасягненні ўзросту мужчынамі 60 гадоў, жанчынамі 55 гадоў;

✓якія атрымліваюць пенсію па інваліднасці, — незалежна ад узросту.

Пенсія за асаблівыя заслугі не прызначаецца грамадзянам, якія маюць судзімасць.

Хадайніцтва аб устанаўленні (пераглядзе памеру) пенсіі за асаблівыя заслугі ўзбуджаецца рэспубліканскімі органамі дзяржаўнага кіравання і іншымі дзяржаўнымі арганізацыямі, падпарадкаванымі ўраду Рэспублікі Беларусь, аблвыканкамамі (Мінскім гарвыканкамам), кіруючымі органамі рэспубліканскіх грамадскіх і рэспубліканскіх дзяржаўна-грамадскіх аб'яднанняў (саюзаў) з улікам меркавання працоўнага калектыву, у якім працаваў грамадзянін.

## Павышэнне пенсійнага ўзросту — не панацэя

**65 гадоў — сярэдні ўзрост выхаду на пенсію ў развітых краінах. І практычна ўсе яны збіраюцца яшчэ павысіць планку пенсійнага ўзросту. Адна з рэкамендацый Сусветнага банка для нашай краіны — таксама падняць пенсійны ўзрост. Сёння ён у Беларусі складае 55 гадоў для жанчын і 60 гадоў для мужчын.**

Аднак далёка не ўсе з гэтым згодныя. «Сярод нашых пенсіянераў вельмі вялікая доля хворых на хранічныя хваробы. Мы толькі па бальнічных лістах будзем мець шмат выдаткаў. Да таго ж гэта вельмі непапулярная мера. Думаю, мы можам дасягнуць тых жа вынікаў менш балючымі спосабамі. Да прыкладу, за кожны адпрацаваны год звыш пенсійнага ўзросту можна даваць да 6% дадатковай пенсіі, як гэта робяць у некаторых краінах свету», — заявіла на «круглым стале», арганізаваным Бізнэс-саюзам прадпрымальнікаў і наймальнікаў імя прафесара М.С. Куняўскага (БСПН) сумесна з Федэрацыяй прафсаюзаў Беларусі і пры падтрымцы Усходняга камітэта Германскай эканомікі, **кандыдат эканамічных навук Наталля ПРАКОФ'ЕВА**.

Як паказалі разлікі беларускіх эканамістаў, павышэнне пенсійнага ўзросту дасць толькі часовы эфект.

Так, **кандыдат эканамічных навук Леанід ЗЛОТНІКАЎ** паведаміў, што разам з Наталляй Пракоф'евай стварыў мадэль, якая паказвае, як будзе рэагаваць фонд сацыяльнай абароны на тыя ці іншыя параметры. Аказалася, калі нічога не змяняць, то, пачынаючы з 2014 года, у фонду можа ўзнікнуць дэфіцыт сродкаў. Такая ж дата, дарэчы, атрымалася і ў Сусветнага банка. Гэтай падзеі варта чакаць плюс-мінус адзін-два гады.

Калі з 2012 года на 5 гадоў павялічыць тэрмін выхаду на пенсію мужчын і жанчын, то мадэль паказвае вялікі прафіцыт фонду, аднак потым ён знікае. Гэта значыць, нават значнае павелічэнне ўзросту выхаду на пенсію дапамагае, але не вырашае праблему, лічыць спецыяліст. Што ж дасць магчымасць фонду быць бездэфіцытным? Як паказала мадэль, калі пакінуць усё, як ёсць, то прыйдзецца моцна паніжаць пенсію. Калі вар'іраваць пенсійны тарыф, то памер пенсій расце, а калі зніжаць пенсійны тарыф, то зніжаецца і пенсія. Атрымаць бездэфіцытны фонд можна, калі закласці ў параметры штогадовы 5-працэнтны рост валавога ўнутранага прадукту (ВУП). «Атрымліваецца, што больш значны — эканамічны рост, а не пенсійны ўзрост», — заявіў Леанід Злотнікаў.

### ПЕНСІЙНЫ ЎЗРОСТ У РОЗНЫХ КРАІНАХ

| Краіны | Мужчыны | Жанчыны |
|---|---|---|
| Беларусь | 60 | 55 |
| Расія | 60 | 55 |
| Украіна | 60 | 55 (плануецца павялічыць да 60) |
| Казахстан | 63 | 58 |
| Польшча | 65 | 60 |
| Германія | 65 (плануецца павялічыць да 67) | 65 (плануецца павялічыць да 67) |
| Францыя | 60 (плануецца павялічыць да 62) | 60 (плануецца павялічыць да 62) |
| Вялікабрытанія | 65 | 60 |
| ЗША | 65 | 65 |
| Італія | 66 | 62 |
| Нарвегія | 67 | 67 |
| Швецыя | 65 | 65 |
| Японія | 70 | 70 |

## Ёсць пытанне

***? У мяне стаж 38 гадоў, 11 месяцаў, 21 дзень. У налічэнні пенсіі ўзята 38 гадоў. Хіба гэта справядліва? І ці будзе перагледжана гэтае становішча?***

**Аляўціна Гарноўская,** *Шуміліна Віцебскай вобл.*

Адказвае **начальнік аддзела развіцця пенсійнай сістэмы галоўнага ўпраўлення пенсійнага забеспячэння і сацыяльнага страхавання Мінпрацы і сацыяльнай абароны Таццяна ПАГОНЫШАВА**:

— Вы можаце дапрацаваць дзевяць дзён да поўнага года, адмовіўшыся ад пенсіі на гэты час. Тады для вылічэння вашай пенсіі будзе прынята 39 гадоў. Вылічэнне стажу ў поўных гадах — агульнапрынятая практыка. Адносна справядлівасці такога падыходу адзначу, што ў стаж нароўні з працай залічваюцца перыяды без выплаты пенсійных узносаў (вучоба, служба ў арміі, догляд дзяцей і інш.) Таксама ў выбарчным парадку вызначаецца каэфіцыент заробку (за найбольш выгадны перыяд). Такім чынам, абмежаванне адных параметраў ураўнаважваецца льготным вылічэннем іншых.

***? Які на сёння максімальны памер пенсіі прызначаецца пры выхадзе на пенсію ў 2011 годзе? Ці ёсць абмежаванні, калі стаж 30 гадоў, заробак высокі, ільгот няма?***

**А.Э. Халева,** *Мінск*

Адказвае **начальнік аддзела арганізацыі пенсійнага забеспячэння галоўнага ўпраўлення пенсійнага забеспячэння і сацыяльнага страхавання Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Ніна ЛУЗІНА**:

— Максімальны памер пенсіі па ўзросце ў снежні 2011 года складае для непрацуючых пенсіянераў 1 504 460 рублёў. Пенсія ў такім памеры прызначаецца жанчыне пры наяўнасці стажу работы 40 гадоў і індывідуальным каэфіцыенце заробку 4,0 і вышэй. Калі працягласць стажу і велічыня індывідуальнага каэфіцыента ў пенсіянеркі меншыя, адпаведна меншы памер яе пенсіі.

Надзённае

## Усё, што вы хацелі спытаць пра пенсіі...

**КАЛІ НАДЫХОДЗІЦЬ ПЕНСІЙНЫ ЎЗРОСТ, З ЧАГО ПАЧАЦЬ АФАРМЛЕННЕ ПЕНСІІ? ШТО ПАВІНЕН ЗРАБІЦЬ САМ ЧАЛАВЕК І ШТО — АРГАНІЗАЦЫЯ, У ЯКОЙ ЁН ПРАЦУЕ?**

Абавязак па падрыхтоўцы дакументаў, неабходных для прызначэння пенсій працуючым грамадзянам, ускладзены на працадаўцу па месцы апошняй працы. У мэтах запатрабавання дакументаў, неабходных для прызначэння пенсіі, у тым ліку аб стажы і заробку, прадстаўнік працадаўцы, адказны за падрыхтоўку пенсійных дакументаў, абавязаны папярэдне (на працягу года да набыцця работнікам права на пенсію) накіраваць адпаведныя запыты. Грамадзянін таксама можа прыняць удзел у зборы неабходных для назначэння пенсіі дакументаў.

**У САВЕЦКІЯ ЧАСЫ НА ПАМЕР ПЕНСІІ ЎПЛЫВАЎ БЕСПЕРАПЫННЫ СТАЖ ПРАЦЫ. ЦІ ЎЛІЧВАЕЦЦА ЁН ПРЫ ВЫЗНАЧЭННІ ПАМЕРУ ПЕНСІІ Ў ЦЯПЕРАШНІ ЧАС?**

